Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 20 1933 г. № 109 (4653)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Шчырае прывітаньне бальшавікам, калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам Случчыны і Чырвонай Слабады, з гонарам выканаўшым баявое заданьне партыі і ўраду, завяршыўшым плян веснавой сяўбы!

МЕСЯЧНІК БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ

Сёньня на БССР пачынаецца месячнік друку, абвешчаны ЦК КП(б)Б. Гэты месячнік павінен узьняць на вышэйшую ступень партыйнае кіраўніцтва друкам, палепшыць работу самога друку, асабліва нізавога, палепшыць работу з рабселькорамі.

Друк як СССР, так і БССР за гады першай пяцігодкі гігантскі вырас. Па ўсім СССР ёсьць 2.000 раённых і 3.000 фабрычна-заводзкіх газэт. У нас, у Беларусі, амаль усе раёны маюць газэты. Фабрычна-заводзкіх газэт — 105. Пачынаюць стварацца газэты пры МТС. Большы ўзрасла колькасьць насьценных газэт.

Побач з колькасным ростам расьце і якасьць нашага друку. Гэты якасны рост заключаецца ў тым, што нізавы друк пачынае набываць усё лепшыя рысы бальшавіцкага друку — партыйнасьць, канкрэтнасьць, масавасьць, апэрацыйнасьць і высокую дзейснасьць. Наш друк умацаваў і пашырыў свае сувязі з масамі, знайшоў дзесяткі новых форм учэпу на масы, форм арганізацыі іх.

Сіла нашай бальшавіцкай партыі, сіла нашага бальшавіцкага друку ў тым, што яны акружаюць сябе мільёнамі беспартыйнага актыву. Армія рабселькораў — гэта армія актыўных будаўнікоў сацыялізму, гэта армія, якая пад кіраўніцтвам партыі вядзе барацьбу з клясавым ворагам, выкрывае авантурыста, лодыра, рвача, ускрывае недахопы на тых ці іншых участках будаўніцтва, сваім актыўным умешваньнем зьмяняе гэтыя недахопы і асабістым прыкладам падцягвае асталёных.

Мы сёньня ў «Зьвязьдзе» прыводзім шмат прыкладаў, як рабкоры-ударнікі змагаюцца за прамфінплян. Рабкоры **Арошкер, Кажушка** — на заводзе «Бальшавік», **Яглейка, Амбразьвіч, Сьцефанюк** і інш. — на заводзе імя Варашылава, **Зьбічынскі, Некраш, Анчаронак** — на заводзе «Камунар» зьвяртаюцца сапраўднымі перадавікамі-ударнікамі, барацьбітамі за сацыялістычную дысцыпліну працы. Такіх рабселькораў-ударнікаў шмат.

Фабрычна-заводзкі друк за апошнія гады высунуў рад новых дзейсных форм ударнай масавай работы: унутрызаводзкія рэйды, ударныя брыгады па праверцы якасьці, рабкоўскія тэхнічныя канфэрэнцыі, пераклічкі брыгадзіраў, завочныя канфэрэнцыі па якасьці і г. д. **Зрабіць гэтыя лепшыя вопыты фабрычна-заводзкага друку здабыткам калгасных, саўгасных, брыгадных і МТС'аўскіх газэт — адна з важнейшых задач месячніка друку.** Фабрычна-заводзкі друк павінен за гэты месяц дабіцца таго, каб газэты падшэфных калгасаў сталі балявымі органамі, здольнымі арганізаваць масы калгасьнікаў на пасьпяховае завяршэньне сяўбы і падрыхтоўку да праполачнай і ўборачнай кампаній.

Значна палепшылася якасьць і калгасных газэт. Мы сёньня ў «Зьвязьдзе» прыводзім шмат фактаў сапраўднай бальшавіцкай барацьбы раду газэт калгасаў за тэмпы і якасьць сяўбы. Але ўсё-ж пераважная частка нашага калгаснага друку працуе нічэ слаба. Асноўны яго недахоп — **слабасьць масавай работы.** Гэты недахоп калгаснага друку адбіваецца на рэённым і цэнтральным друку. «Віноваты тут у першую чаргу нашы раённыя, абласныя і цэнтральныя газэты. Не перабудавалі яны сваёй работы з селькорамі. Ня вучылі селькораў уваходзіць глыбей у дэталі і дробязі калгаснага жыцьця і работы, ня ўзбройвалі селькораў уменьнем распазнаваць новую тактыку клясавага ворага. Таму крытыка селькора станавілася нярэдка павярхоўнай, бяззубай і маладушнай. Распаўзаліся і адыходзілі ад актыўнай работы ў друку асобныя селькоры, ня бачачы рэальных, дзелавых рэзультатаў сваёй крытыкі». (**Постышаў**).

Задача цэнтральнага і раённага друку, райкомаў, палітаддзелаў і партыйных ячэек — канкрэтным кіраўніцтвам дапамагчы палепшэньню работы газэт МТС, саўгасаў і калгасаў. Трэба дабіцца таго, каб голас сельскора мацней гучэў са старонак друку, каб крытыка яго была запальнай, дзелавой і праўдзівай, падмацаванай асабістым прыкладам ударнай працы, веданьнем тэхнікі справы, каб селькор давёз сваю пачатую справу да канца.

Асаблівымі клопатамі, асаблівай увагай мы павінны акружыць новую порасьль бальшавіцкага друку — брыгадную і палявую газэту ў калгасе. Гэтыя газэты яшчэ ня маюць належнага вопыту, ня маюць даволі падрыхтаваных арганізатараў, але разам з тым гэтыя газэты адыгрываюць вялізарнейшую ролю ў жыцьці калгасу або саўгасу, бо ў іх ёсьць магчымасьць быць больш аперацыйнымі, больш канкрэтнымі, больш масавымі, больш дзейснымі. Вакол гэтых газэт могуць быць выхаваны сапраўдныя сельскоры-ударнікі. Праз гэтыя газэты можна арганізаваць сапраўдны кантроль за кожным працэсам вытворчасьці, за кожнай дэталлю калгаснага жыцьця, за кожным чалавекам. Усе гэтыя магчымасьці могуць стаць рэальнасьцю пры тэй умове, калі будзе забясьпечана сыстэматычнае, штодзённае партыйнае кіраўніцтва гэтымі брыгадными газэтамі, калі ім будзе аказвацца пастаянная і канкрэтная дапамога.

Месячнік друку ў калгасе трэба выкарыстаць для ўсёмыу барацьбы за ўраджайнасьць, разьвіцьця ўдарніцтва, для праверкі радоў селькораў, для праверкі бальшавіцкай пільнасьці калгаспай газэты: як яна зьвязана з калгасьнікамі, як змагаецца з недахопамі, злодзеямі, лодырамі, як яна паказвае сумленных калгасьнікаў. Месячнік друку ў вёсцы трэба адзначыць уздымам ударніцтва сярод саміх сельскораў, вылучэньнем такіх селькораў, якія лепш за другіх працуюць, лепш аруць, лепш сеюць.

Друк Беларусі спаборнічае з друкам Заходняй вобласьці. У дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва абодвы бакі ўзялі на сябе рад абавязацельстваў. Як выконваюцца гэтыя абавязацельствы намі, друкам Беларусі? Пакуль што дрэнна выконваем гэтыя абавязацельствы. **Спаборніцтва яшчэ не адчуваецца на старонках нашага друку.** Возьмем «Віцебскі пралетарэц». Ён спаборнічае з Ярцаўскай газэтай Заходняй вобласьці. Але хто ведае пра гэта спаборніцтва? У лепшым выпадку — работнікі редакцыі. Масы калгасьнікаў, нізавы друк Віцебшчыны пра гэта ня ведаюць, бо на старонках «Віцебскага пралетара» гэта спаборніцтва не адбіваецца. А не адбіваецца таму, што яно яшчэ ня стала дзейсным, практычным, канкрэтным. Яно, гэта спаборніцтва, яшчэ ня выйшла са стадыі дэкларацыйных абяцаньняў. Такое-ж становішча з газэтамі **Мсьціслаўскага, Клімавіцкага** і іншых раёнаў, якія спаборнічаюць з газэтамі раёнаў Заходняй вобласьці.

Ва ўчарашным нашым перадавым артыкуле мы адзначылі, што **нездавальняюча выконваем сацыялістычны дагавор з Заходняй вобласьцю, нездавальняюча ажыцьцяўляем пастановы першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, незыстарчальна выкарыстоўваем вопыт лепшых саўгасаў, МТС і калгасаў Заходняй вобласьці. За ўсё гэта ў вельмі вялікай ступені віна падае і на нашы друк. Наша задача — у месячнік друку нагкаць прапушчанае, ператварыць спаборніцтва з Заходняй вобласьцю ў мацнейшую зброю мабілізацыі мас на перамоцнае завяршэньне сяўбы, падрыхтоўку да праполачнай і ўборачнай.**

У сувязі з надыходзячай чысткай партыі перад друкам стаіць задача — растлумачыць масам мэты і задачы чысткі, прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўчай рабоце, выкрываць апартуністаў, двурушнікаў, перараджэнцаў, якія не жадаюць на справе змагацца з клясавым ворагам. У гэту важнейшую справу павінны быць уключаны ня толькі раённыя і фабрычна-заводзкія газэты, але і цэхавыя, калгасныя, саўгасныя, брыгадныя. Ра ённаму друку трэба тут дапамагаць нізавому друку, бо чыстка — справа вельмі складаная і палітычна адказная.

У месячнік друку яшчэ шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва на фабрыках, заводах, у калгасах і саўгасах, яшчэ больш завострым сваю клясавую пільнасьць, яшчэ вышэй узьнімем сьцяг партыйнасьці ў рабоце друку, дабіўшыся яшчэ больш бурнага росту палітычнай актыўнасьці рабселькораў і ўсіх працоўных.

Мы гатовы біцца за новыя вялікія перамогі ў будаўніцтве сацыялізму

ГРАНДЫЁЗНЫ МІТЫНГ У МАСКОЎСКІМ ПАРКУ КУЛЬТУРЫ І АДПАЧЫНКУ

МАСКВА, 19. (БЕЛТА). Дзесяткі тысяч рабочых і работніц, вучоных навуковых работнікаў, працоўных Масквы арганізавана зьявіліся ўчора ў парк культуры і адпачынку, каб дэманстраваць сваю бліскучую перамогу на фінансавым фронце—выкананьне кантрольнага заданьня па пазыцы першага году другой пяцігодкі.

Бурнымі аплёдысмэнтамі была спаткана прапанова аб выбраньні ганаровым старшынёю мітынгу тав. Сталіна. У ганаровы прэзыдыум мітынг выбраў т. т. СТАЛІНА, МОЛАТАВА, КАГАНОВІЧА, КАЛІНІНА, ВАРАШЫЛАВА, АРДЖАНІКІДЗЭ, КУЙБЫШАВА, АНДРЭЕВА, КІРАВА, КАСІЁРА, РУДЗУТАКА, ПОСТЫШАВА, ТЭЛЬМАНА І МАКСІМА ГОРКАГА.

Народны камісар Фінансаў СССР тав. ГРЫНЬКО паведаміў сабраўшымся ир каторыя вынікі рэалізацыі пазыкі. На ўчарайшы дзень, г. зн. на 17 мая, толькі МАСКОЎСКАЯ І ЛЕНІНГРАДСКАЯ ВОБЛАСЬЦІ ПАДПІСАЛІСЯ БОЛЬШ ЧЫМ НА 600 МЛН. РУБ. У РАДЫ ПЕРАДАВІКОЎ, АПРАЧА МАСКВЫ І ЛЕНІНГРАДУ, ВЫЙШЛІ ТАКСАМА СЬВЯРДЛОЎСК, ІВАНАВА, ГРОЗНЫ, СТАЛІНГРАД, ТУЛА, ПЕРМ, БАКУ, КАЛІНІН І РАД СЕЛЬСКІХ РАЁНАЎ. Кожны дзень прыносіць з усіх канцоў Саюзу паведамленьні аб выкананьні кантрольнага заданьня па пазыцы.

Па сканчэньні дакладу тав. Грынько, сходу рапартавалі аб пасьпяховым сканчэньні падпіскі прадстаўнікі маскоўскіх і тульскіх прадпрыемстваў, калгасьнікаў і Чырвонай арміі.

У канцы мітынгу выступіў сэкратар ЦК і МК партыі тав. Л. М. КАГАНОВІЧ, спатканы гарачымі авацыямі 50-тысячнай аўдыторыі. Прамову тав. Кагановіча перадаем па жывому запісу.

Выступленьне тав. Л. М. Кагановіча

Таварышы! Тое, што нашы працоўныя масы,—гаворыць тав. Каганові ч,— так хутка выканалі плян пазыкі першага году другой пяцігодкі, зьяўляецца ня толькі выяўленьнем нашай перамогі, але і паказвае, што мы з вамі гатовы біцца за новыя, вялікія будучыя перамогі ў будаўніцтве сацыялізму. У той час, калі сучаснае становішча капіталістычнага сьвету характарызуецца як становішча хаосу; у той час, калі ангельскі ўрад у сваім пісьце амэрыканскаму ўраду піша, што крэдытна-грашовы мэханізм сучаснага капіталістычнага сьвету разьбіт ушчэнт: у той час, калі там сотні банкаў попаюцца,—у гэты самы час тут, у нас, у нашай краіне, мы з вамі, таварышы рабочыя, работніцы, калгасьнікі, умацоўваем наша фінансавае прамысловае і агульна-гаспадарчае становішча.

Буржуазныя вучоныя, буржуазныя карэспандэнты зьдзіўляюцца, як гэта бальшавіком удаецца на іх чырвонец будаваць завод за заводам, будаваць новыя чыгункі, капальні, нафтавыя прамыслы, мэтрапалітэн. Яны не разумеюць, што наша грашовая гаспадарка карэнным чынам адрозьніваецца ад грашовай гаспадаркі капіталістычнага сьвету—таго сьвету, які пабудован на крыві, на касьцях мільёнаў прыгнечаных працоўных мас. Яны не разумеюць, што нашы грашовая гаспадарка апіраецца на ўсю магутнасьць сацыялістычнай гаспадаркі.

Мы будуем свае заводы, мы перабудавалі і перабудоўваем адстапую, старую, забітую, няпісьменную, бездарожную, цёмную Расію—у новую, вялікую, магутную, мэханізаваную краіну вольнай сацыялістычнай працы. І гэту перабудову мы вядзем па плану, пад кіраўніцтвам нашага вялікага правадыра тав. Сталіна. Рэальнасьць пляну —гэта мы з вамі, жывыя людзі, сказаў тав. Сталін, жывыя людзі, якія былі прыгнечаны, а цяпер сталі вольнымі. Рэальнасьць нашага пляну—гэта вопыт мільёнаў новых людзей змагацца і будаваць сваё жыцьцё. Мы ўлажылі за чатыры гады першай пяцігодкі 48,4 млрд. рубл. у нашы новыя заводы і калгасы. Мы затрацілі паўтара млн. руб. золатам на закупку заграніцай машын для перабудовы нашай краіны.

Так, мы ўлажылі шмат мільярдаў і пусьцілі шмат новых заводаў. А вось у Германіі, напрыклад, старыя заводы закрываюцца. Немцы плацяць кантрыбуцыю, яны плацяць старыя даўгі. Капі-б і нам прышлося плаціць старыя шматмільярдныя царскія даўгі, якія скасаваны Кастрычніцкай рэвалюцыяй, дык гэта-б складала кожны год сотні млн. рубл. золатам. У нас былі-б падаткі, якія пайшлі-б не на воды, не на школы, а на ўплату процантаў за старыя царскія даўгі.

Мы пабудавалі ў адным Маскве за чатыры гады больш 3 тысяч новых дамоў—2,5 млн. кв. мэтраў жыльпёвай плошчы. У адным толькі 1933 г. мы ўкладаем па Маскве на будаўніцтва новых дамоў 175 млн. рубл.

Мы пашырылі водаправодную сетку ў Маскве, а з прычыны таго, што мы хочам, каб наш рабочы, каб наш маскоўскі грамадзянін меў больш вады для чыстаты і санітарыі і з прычыны таго, што нам пагражае небясьпека недастачы вады, дык мы будуем канал, які злучыць Маскву-раку з Волгай. Гэта дасьць нам магчымасьць атрымлівать у шмат разоў больш вады для на сельніцтва і мець параходныя зносіны з Волгаю.

Мы пашырылі сетку каналізацыі. Не каторыя таварышы думаюць, што каналізацыя—справа няважная. Не, тавы рышы, бяз добрай каналізацыі ў такім горадзе, як Масква, з яе 3-х з лішнім мільёнамі насельніцтва, можа атрымаць такое паветра, што нам ніякія дрэвы не дапамогуць. (Сьмех).

Мы будуем мэтрапалітэн. У гэтым годзе мы на яго затрачваем 110 млн. руб., а ў цэлым ён будзе каштаваць ня менш 600 млн. рублёў.

У нас на асьвету расходуюцца вялізарныя сумы. За першую пяцігодку мы павялічылі школьныя будынкі ў Маскве на 1/3 частку. Мы пабудавалі 9 хлебазаводаў, канчаем пабудову яшчэ трох і гэтым на сто проц. мэханізуем наша хлебапячэньне. Мы перабудоўваем нашу старую Маскву з яе аднапавярховымі домікамі, з яе камяным брукам, з яе 100-гадовым пылам, Маскву бяз зелені, без выстарчальных трамвайных ліній. Старэньку Маскву мы з вамі перабудоўваем у вялікую сталіцу пралетарскай дзяржавы. Мы з вамі павінны любіць кожны куток, кожны пункт свайго гораду, бо наша сталіца заваявана мазалямі і крывёю мільёнаў. Мы павінны пабудаваць такі магутны горад, з якім ня здольны будуць параўнацца сучасныя хваленыя буржуазныя гарады і сталіцы. Мы перабудоўваем гарады і вёскі на новы лад.

Вось для чаго патрэбны грошы. Вось куды ідуць рабочыя працоўныя капейкі. Яны ідуць на справу, на новае жыцьцё, на новую вёску, на прамысловасьць, на прасоўваньне наперад.

У нас ёсьць труднасьці. Але бальшавікі тым і характарызуюцца, што пры ўзьнікненьні труднасьцяй яны не хаваюцца, а ідуць у масы і гавораць ім: «Таварышы, у нас вось такія і такія труднасьці, але мы павінны гэтыя труднасьці перамагчы».

У той час, калі буржуазны сьвет задыхаецца ў кляшчох крызісу, у той час, калі навісаюць новыя пагрозы вайны, у той час, калі буржуазія шукае выхаду ў фашызьме і ў далейшым прыгнечаньні мас,—у гэты час наша савецкая краіна расьце і мацнее. Наша Чырвоная армія ўзброена ня толькі вінтоўкаю. Аднэй вінтоўкаю зараз мала што можна рабіць. Мы стаім за мір, наш урад змагаецца за мір, як ніякі іншы. Мы ведаем, што капіталізм загніе ад сваіх-жа рабочых. Нам трэба абараняць сваю краіну. І мы гаворым. Ведайце, у нас цяпер рукі ня пустыя, у нас ёсьць чым абараняцца. І маленькія танкетачкі, на нашых заводах пабудаваны, і танкі большыя, і яшчэ большыя, якія змогуць ударыць па ворагу. (АПЛЁДЫСМЭНТЫ). У нас ёсьць маленькія самалёты-разьведчыкі. У нас ёсьць двухматорныя і трохматорныя аэраплёны, на якіх нашы лётчыкі змогуць далятаць да ворага, калі ён захоча дабрацца да нашай сьвятой сацыялістычнай зямлі. (БУРНЫЯ АПЛЁДЫСМЭНТЫ).

Ёсьць, таварышы, у нас труднасьці і ў галіне сельскай гаспадаркі. Мы перабудоўваем старую цераспалосную зямлю на новы лад сацыялістычных палёў. Справа цяжкая, справа складаная. Аднак, веснавая сяўба ідзе ў нас у гэтым годзе значна лепш, чым летась, бо яна лепш арганізавалася. Нехай кожны рабочы, нехай кожны працоўны ведае, што бальшавікі, што ЦК бальшавікоў, што наш правадыр тав. Сталін на вецер споў ня кідаюць. А самы-ж сказалі: вёску, старую вёску, замы-ж сказалі: вёску, старую вёску, замы-ж сказалі: вёску, старую вёску, зам

УКП(б)Б

Крычаў

Сяўба ў раёне праходзіць вельмі марудныімі тэмпамі. Да 15 мая плян быў выканан толькі на 31,9 проц., а аднаасобнікамі на 6,4 проц.

Выходзячы з гэтага, бюро РК КП(б)Б абвясціла пяцідзеньнік штурму. Задачы пяцідзеньніка—забясьпечыць поўнае скончэньне сяўбы па ўсіх культурах. Кожнай партыйнай ячэйцы дадзена канкрэтнае ўказаньне па правядзеньні пяцідзеньніка штурму.

Першыя дні штурму далі прыметныя зрухі. Калгасы і аднаасобнікі значна ўзмацнілі тэмпы сяўбы. Калі, напрыклад, да пачатку пяцідзеньніка ў Бавўскім сельсавеце штодня засявалі па 40 га, дык 15 мая засеяна 81,5 га. У першы-жа дзень штурму адстаючыя калгасы «Чырвоны кастрычнік» і «Чырвоная горка» дабіліся завяршэньня сяўбы збожжавых. Калгасьнікі гэтых калгасаў у сувязі з прыездам у раён сакратара ЦК КП(б)Б тав. Жаброўскага абавязаліся скончыць сяўбу ільну, бульбы і астатніх культур на працягу аднаго дня.

Тураў

У сувязі з тым, што Тураўскі раён на бліжэйшы час адстае ад іншых раёнаў, бюро РК КП(б)Б прыняла пастанову аб неадкладным разгортваньні работы па падрыхтоўцы да прапольнай кампаніі.

15 мая гэта пытаньне было прапрацавана на жаночых сходах ва ўсіх калгасах.

Прапольная кампанія мінулага году па Тураўскім раёне праходзіла зусім незадавальняюча. Таму РК КП(б)Б прапанаваў усім ячэйкам неадкладна разгарнуць шырокую масавую работу, перш за ўсё сярод жанчын-калгасьніц і аднаасобніц аб значэньні і задачах прапольнікі.

15-22 мая ва ўсіх сельсаветах раёну праводзіцца куставыя зьлёты калгасьніц, дзе абгаварваецца пытаньне аб першых выніках сяўбы і аб задачах прапольнай кампаніі.

Чырвоная Слабада

Раён завяршае сяўбу. Трэба заразжа пераключыць сілы на ўдарную падрыхтоўку да прапольнай і ўборачнай кампаніі. Райком КП(б)Б, улічыўшы гэта, вынес рашэньне: 25 мая правесьці раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў. Зьлёт абгаворыць і прапрацуе толькі адно пытаньне—выніхі барацьбы за веснавую сяўбу і разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў часе правядзеньня прапольна-уборачнай кампаніі. На зьлёт будуць выбірацца лепшыя калгасьнікі-ударнікі, якія занялі першынство па сяўбе ў раёне. Усяго на зьлёце будзе 300 дэлегатаў.

Для арганізацыі падрыхтоўчай работы да зьлёту пры РК КП(б)Б створана камісія ў складзе таварышоў: Шапалёнка (старшыня), Прыхоцька, Каваль чука, Лук'яновіча і Зэгліна.

Рэдакцыя раённай газэты «Калгасьнік» ужо разгарнула падрыхтоўчую работу, высунуўшы лёзунг—змагацца за права пасьлі дэлегатаў на раённы зьлёт.

СУПРОЦЬ АНТЫЛЕНІНСКІХ УСТАНОВАК

(Аб артыкуле т. Левіна—„Маркс-Энгельс-Ленін-Сталін")

Рэдакцыя «Зьвязды» лічыць абавязкам адзначыць, што ў артыкуле тав. Я. Левіна «Маркс-Энгельс-Ленін-Сталін», надрукаваным у «Зьвязьдзе» ад 14 сакавіка 1933 г., ёсьць, побач з некаторымі блытаным фармулёўкамі, рад тэарэтычна-палітычна-шкодных месц.

Так, тав. Левін піша: «Так называемы «марксызм» II Інтэрнацыяналу — гэта асобны від марксызму, марксызм дагматычны, у адрозьненьне ад ленінізму, марксызму дзейснага, творчага».

Такім чынам, у той час, калі Камінтэрн у сваёй адозьве, прысьвечанай 50-годзьдзю сьмерці Маркса, выразна падкрэсьліў, што «ленінізм — гэта АДЗІНЫ марксызм нашай эпохі», у той час, калі Камінтэрн заклікае рабочых падумаць, «ці можа быць два марксызмы», тав. Левін разьвівае антыленінскае цьверджаньне, што ёсьць два віды марксызму — дзейсны, творчы марксызм Леніна—Сталіна і дагматычны марксызм II Інтэрнацыяналу.

Гэта ўстаноўка аб'ектыўна змыкаецца з тым, што гавораць фальсыфікатары марксызму так званыя «левыя» сацыял-фашысты (Бауэр, Адлер), якія з мэтай ашуканьня рабочых «прабуюць прыкрыцца марксызмам» і дэмагагічна «абаяшчаюць», «быццам ёсьць «дзьве марксыцкія партыі», адной з якіх зьяўляецца партыя сацыял-фашызму» (з адозвы Камінтэрну).

Тав. Левін піша: «Сталін, гаворачы аб дзьвёх групах марксыстаў, адносіць Пляханава, Каўцкага да тэй групы марксыстаў, да правадыроў мірнага часу, якія «моцныя ў тэорыі, але слабыя ў справах арганізацыі і практычнай работы. Такія правадыры папулярны толькі ў верхнім пласьце пралетарыяту, і то толькі да пэўнага часу; з наступленьнем рэвалюцыйнай эпохі, калі ад правадыроў патрабуюцца рэвалюцыйна-практычныя лёзунгі, тэарэтыкі зыходзяць са сцэны, уступаючы месца новым людзям. Такавы, напрыклад, Пляханаў у Расіі, Каўцкі ў Германіі» (Сталін аб Леніне, «ОГИЗ» 1931 г., стар. 14).

Ці магчыма на падставе гэтых слоў тав. Сталіна рабіць вывад аб якімсьці «асобным відзе марксызму» і адносіць да гэтага «асобнага віду марксызму» тэорыю II Інтэрнацыяналу? Зразумела, не. Гэткае спасыланьне на тав. Сталіна зьяўляецца вульгарызатарскім скажэньнем выказваньняў т. Сталіна.

Таксама недапушчальна спасыланьне на выступленьне т. Сталіна на VI зьезд дзе нашай партыі. У сувязі са спробай Прэабражэнскага працягнуць у палітычнай рэзалюцыі трацкісцкую думку аб тым, што ў нашай краіне сацыялістычнае будаўніцтва немагчыма без папярэдняй перамогі пралетарскай рэвалюцыі на Захадзе, тав. Сталін сказаў: «Я супроць такога заканчэньня рэзалюцыі. Ня выключана магчымасьць, што іменна Расія зьявіцца краінай, якая пракладвае шлях да сацыялізму. Трэба адкінуць аджыўшае ўяўленьне, што толькі Эўропа можа паказаць нам шлях. Існуе марксызм дагматычны і марксызм творчы. Я стаю на глебе апошняга».

Ці магчыма на падставе гэтага ўказаньня, зробленага тав. Сталіным, што нельга дагматычна пераносіць папажэньні правільныя для эпохі прамысловага капіталізму, на эпоху імпэрыялізму, ня ўлічваючы зьмененых гістарычных умоў, што ёсьць людзі, якія ператвараюць асобныя палажэньні марксызму ў догму і не разумеюць неабходнасьці ўлічваць зьмены ў клясавай абстаноўцы, ці магчыма на падставе гэтых указаньняў тав. Сталіна рабіць вывад, што тэорыя II Інтэрнацыяналу, які замяніў рэвалюцыйную філёзофію дыялектычнага матар'ялізму рэакцыйным ідэалізмам, замяніў тэорыю клясавай барацьбы супрацоўніцтвам з буржуазіяй, замяніў вучэньне аб пэрыядычных крызісах тэорыяй арганізаванага капіталізму, замяніў дыктатуру пралетарыяту тэорыяй каліцыйных урадаў і капітуляцыяй перад фашызмам, — што гэта тэорыя ёсьць «асобны від марксызму» — дагматычны марксызм? Зразумела, не. Сацыял-фашысты нічога агульнага ня маюць з марксызмам, апрача таго, што яны часам прыкрываюцца марксыцкай фразэалёгіяй, і таму іх ні ў якім разе нельга характарызаваць цяпер, як «дагматычных марксыстаў». Такога роду цьверджаньне знаходзіцца ў нялрымірнай супярэчнасьці з думкамі, выказанымі тав. Сталіным у пытаньнях ленінізму, з яго выразнай заявай аб тым, што «паміж сацыял-дэмакратызмам і марксызмам лягло бязданьне. Ад гэтага часу адзіным носьбітам і аплотам марксызму зьяўляецца ленінізм і камунізм».

Ня менш папітычна-шкодныімі зьяўляюцца антыленінскія разважаньні тав. Левіна аб суадносінах клясы і партыі. Тав. Левін піша: «Ясна, што абараніць асновы марксызму ў Расіі і не для аднэй толькі Расіі, а для ўсяго міжнароднага рэвалюцыйнага рабочага руху, пасьлядоўна дастасоўваць яго да своеасаблівых умоў тагочаснай Расіі, а таксама ўпіхіць вопыт барацьбы ўсяго міжнароднага пралетарыяту, каб самастойна распрацаваць, разьвіваць далей марксаву тэорыю, для чаго трэба было АРГАНІЗАВАЦЬ РАБОЧУЮ КЛЯСУ РАСІІ Ў САМАСТОЯНУЮ ПАРТЫЮ, біцца за яе (рабочай клясы) гегемонію, а гэта было выканана ня Пляханавым, а Леніным, не меншавізмам, а бальшавізмам».

Такім чынам, у поўнай супярэчнасьці з вучэньнем ленінізму аб тым, што партыя ёсьць «ПЕРАДАВЫ АТРАД рабочай клясы», што «партыя ёсьць ПАЛІТЫЧНЫ ПРАВАДЫР рабочай клясы», што «партыя ёсьць БАЯВЫ ШТАБ пралетарыяту» (Сталін), тав. Левін зьмешвае авангард рабочай клясы з усёй рабочай клясай, партыю, як частку клясы, з пралетарыятам. Гэта ёсьць «уняволеньне дэзарганізуючай ідэі аб зьмешваньні клясы і партыі» (Ленін).

Гэта меншавіцкая тэорыя растварэньня партыі і клясы, асабліва шкодная ў сучасны момант, калі ў сувязі з пераможным завяршэньнем пяцігодкі за чатыры гады, мы маем і будзем мець абвастраньне клясавай барацьбы, узмацненьне супраціўленьня апошніх рэш так паміраючых клясаў і іх агентуры, калі для пабудовы бясклясавага грамадзтва неабходна максымальнае ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту, неабходна павышэньне вядучай ролі і баяздольнасьці партыі, як авангарду клясы. Гэту мэту, між іншым, мае і генэральная чыстка партыйных радоў, якая зараз пачынаецца.

Артыкул мае таксама памылковыя і шкодныя выказваньні наконт трацкісцкага паклёпу аб «перараджэньні» ленінізму. Гэтыя выказваньні зводзяцца да спрэчак наконт часу «перараджэньня», замест таго, каб рашуча і безагаворачна адкінуць усякі паклёп ворагаў партыі і пралетарыяту аб «перараджэньні».

Выкрываючы і асуджаючы антыленінскія ўстаноўкі т. Левіна, рэдакцыя прызнае поўнасьцю сваю памылку, якая праявілася ў зьмяшчэньні гэтага артыкулу на старонках нашай газэты.

Справа з артыкулам Левіна яшчэ раз напамінае аб неабходнасьці павесьці рашучую барацьбу за павышэньне якасьці нашай тэарэтычнай прадукцыі, за павышэньне партыйнай пільнасьці і насьцярожанасьці, каб своячасова і энэргічна даваць адпор усякім супроцьленінскім установкам, усякай тэарэтычнай кантрабандзе.

Раўняцца па варашылаўцах!

Варашылаўцы скончылі рэалізацыю пазыкі

Рапарт

Узнагароджаны ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу Менскі машынабудаўнічы завод імя Варашылава пад кіраўніцтвам партарганізацыі заводу, мэтодамі сацыяборніцтва і ўдарніцтва шляхам цахамі, зьменамі і паасобнымі рабочымі і шырока-разгорнутай масава-растлумачальнай работай рэалізаваў пазыку ў першы дзень падпіскі на суму 142.720 руб. і ахапіў ёю 96 проц. усяго ліку рабочых і 106,3 проц. іх месячнага заработку.

17 мая ўжо ўсе 100 проц. рабочых, ІТР і служачых падпісаліся на пазыку ў суме 150.040 руб., што складае 111,7 проц. месячнага фонду зарплаты.

Скончана таксама падпіска па ЗРК заводу на 107,6 проц. месячнага фонду зарплаты, па сталовай на 110,6 проц., па казармасу на 104,9 проц. У падшэфным Грычанскім сельсавеце пры дапамозе брыгады нашых рабочых рэалізавана пазыка на 28.715 р., або 124 проц. заданьня, якое дадзена сельсавету.

Сакрот посьпеху кампаніі — у палітычнай актыўнасьці нашага калектыву, якая ўзрастае ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва, пад правільным ленінскім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало і Менгаркому КП(б)Б, у авангардзе ролі варашылаўскіх бальшавікоў.

Пралетары машына-будаўнічага заводу імя Варашылава, адказючы свае сродкі ў пазыку дзяржаве на будаўніцтва сацыялізму, ведаюць, што сацыялістычнае будаўніцтва ўзмацніце абароназдольнасьць краіны і магутнасьць сусьветнай рэвалюцыі.

Нехай жыве правадыр рабочай клясы — т. Сталін!

Нехай жыве Чырвоная армія — верны вартавы сацыялістычнай будоўлі на чале са сваім правадыром тав. Варашылавым!

Нехай жыве ЦК КП(б)Б і рулявы беларускіх бальшавікоў — т. Гікало!

Сакратар парткалектыву РОЗЭНБЭРГ.
Старшыня заўкому АНДРЭЕЎ.
Дырэктар заводу ДЗІЧКОЎСКІ.
Старшыня камсоду МІНКОВІЧ.
Сакратар камсамельскага калектыву ГОПКАН.

Месячны фонд перакрыт

ДОБРУШ. (Наш сэц. кар.). На пастанову ўраду аб новай пазыцы рабочы калектыў Добрускай паперовай фабрыкі адказаў канкрэтнай справай. «Ня трохтыднёвы заработак, а месячны ў пазыку дзяржаве — вось наш адказ».

У першых радох па рэалізацыі ідзе паккамэрны цэх, які пры фондзе зарплаты ў 23.868 рублёў даў падпіскі — 28 тысяч. Паккамерны цэх узяў на буксар СЦЗ, куды накіравана ўдарная брыгада на чале з таварышом Трацьцяковай.

17-га раніцой падпіска на пазыку па фабрыцы перакрыла месячны фонд зарплаты, дасягнуўшы сумы ў 245.000 руб. Зараз асталіся неахопленымі падпіскай толькі тыя рабочыя, якія знаходзяцца ў адпачынку.

Па прыкладу рабочых фабрыкі праведзена падпіска і ў іншых установах г. Добрушу. Заданьне ў 32.023 рублі горад перавыканаў, — даўшы 33.065 руб. падпіскі.

Такія паказальныя атрыманы ў выніку правільнай расстаноўкі сіл і шырока разгорнутай палітычна-масавай работы. Сакратар парткому фабрыкі тав. Рындзіч і старшыня фабкому Цэйтлін увесь час знаходзяцца ў цэху і арганізуюць масы на выкананьне вытворчай праграмы і заданьня па пазыцы.

А. Манькоў.



Працоўныя Менску у дошкі, якая паказвае ход падпіскі на пазыку

ХРОНІКА ПАДПІСКІ

Калектыў Дзяржпляну БССР падпісаўся на пазыку на 18.110 руб., або 108,2 проц. месячнага заработку.

Аднатасова разгорнута работа сярод калгасьнікаў падпэфнага калгасу «Першая конная», дзе 45 калгасьнікаў падпісаліся ўжо на 2.305 руб.

***

Рабочыя гомельскай шэйнай фабрыкі «Камінтэрн» падпісаліся на новую пазыку на 100,5 проц. агульнага фонду зарплаты. Ахоплена рабочых 98,9 проц. Падпіска працягваецца.

***

Рэдакцыя гайгазэты «Ленінскі прызыў» (Аршанскі раён) падрымала прапанову рэдакцыі «Віцебская пралетара» аб арганізацыі ўсебеларускага спаборніцтва газэт на лепшай рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі. Уключыліся ў гэту работу і выклікала на сацспаборніцтва газэты: «Бальшавік Барысаўшчыны» і «Камунар Магілеўшчыны».

Усю работу па рэалізацыі пазыкі «Ленінскі прызыў» увязвае з правядзеньнем месячніка друку.

***

Рабочыя 4-й дрэваапрацоўчай арцелі імя 2-й пяцігодкі (Менск) падпісаліся на пазыку на 10.100 руб., што складае 108,1 проц. месячнага заработку. Падпіскай ахоплена 98,1 проц. усяго складу рабочых.

***

Калектыў інспэкцыйнага аддзелу Галоўнага кіраўніцтва міліцыі падпісаўся на пазыку на 7.225 руб.

Непераадзе ідуць т. т. **Курылюк, Дарашэвіч, Касьцянаў, Ярашэвіч**, якія падпісаліся ад 130 да 150 проц. свайго месячнага заработку.

***

Калгасьнікі калгасу «Чырвоная зьвязда», Строчыцкага сельсавету, усе як адзін падпісаліся на пазыку другой пяцігодкі. Сума падпіскі складае 1.270 р., або па 57 руб. на кожную гаспадарку.

Калгасьнікі калгасу «Чырвоная зьвязда» выклікалі на сацспаборніцтва па рэалізацыі пазыкі калгасьнікаў калгасу імя Дзяржынскага.

***

238 рабочых і служачых аддзелу грамадзкага харчаваньня ТІТ Аршанскага чыгуначнага раёну падпісаліся на пазыку ў суме 21.350 руб. пры месячным заработку ў 21 тыс. руб.

Асаблівыя ўзоры па падпісцы паказваюць работнікі фільтдарэнкі: Сьмігіноў, Кунцевіч, Прахарэнка, Паддубскі, Юрасоц В. і інш., якія пры зарплаце ў 70 руб. падпісаліся на 100 руб. Служба руху выклікала на сацспаборніцтва ваганістаў т. т. **Барсукоў, Губко, Камароў** і рабочых-ударнікі **Малашкевіч.**

Падпіска працягваецца па ўсім чыгуначным вузле. Па службе руху падпіскай ахоплены 493 чалавекі на суму 57.350

СЁНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА МЕСЯЧНІК ДРУКУ

Палепшым партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам, узьнімем на вышэйшую ступень якасьць нашых газэт, зробім больш гучным голас рабселькора!

Кожны рабкор-ударнік, кожны ўдарнік-рабкор

(Нізавы друк заводаў „Бальшавік", імя Варашылава і „Камунар")

Нізавы друк фабрык і заводаў БССР за апошні год значна вырас. Вырас і па колькасьці і на якасьці работы. У БССР ёсьць больш 100 заводзкіх шматтыражак. Нізавы друк фабрык і заводаў БССР ня толькі значна вырас, але і ўмацаваўся, павысіў сваю баяздольнасьць.

Цяпер ужо няма таго заводу, няма тэй фабрыкі, дзе-б ня было шматтыражнай газэты, друкаванай на машыне, на шклографе ці на рататары. Кожны цэх заводу, фабрыкі, кожная брыгада, зьмена маюць сваю штодзёнку або трохдзёнку.

Фабрычна-заводзкі друк Савецкай Беларусі, як і ўвесь фабрычна-заводзкі друк нашага Саюзу, пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных арганізацый, групуючы вакол сябе рабкораў, арганізоўвае шырокія масы рабочых на барацьбу за выкананьне прамфінпляну і іншых палітычна-гаспадарчых задач, якія ставіць перад намі партыя.

Для прыкладу возьмем некалькі газэт менскіх заводаў.

У цэхах і брыгадах заводу **«БАЛЬШАВІК»** рэгулярна выходзіць 14 штодзёнак. Вакол іх і заводзкай шматтыражкі **«РАБОЧАЕ ВОКА»** — 240 рабкораў-актывістаў. Барацьба за прамфінплян, за палепшэньне бытавых умоў рабочых, за марксыцка-ленінскае выхаваньне рабочых,— вось тыя асноўныя пытаньні, якімі займаюцца штодзёнкі.

Штодзёнка аддзелачнага аддзяленьня першага хромавага цэху **«ЗА РАБОТУ ПА-НОВАМУ»** (рэдактар **Беніновіч**) першай у гарбарні распачала заводзкую кампэрэнцыю па якасьці прадукцыі. На сваіх старонках штодзёнка дала слова рабочым, якія выкрывалі бракаробаў. Так быў выкрыт бракароб **Канорскі**, які зрабіў 13 бракаваных скур. Рабочы **Кальтман**, закладваючы ў плесіровачную машыну адразу на дзве скуры, сыстэматычна рабіў брак. Тав. **Максімава**, напрыклад, вельмі часта «не заўважае», калі выпадае шруба, якая потым пракручвае дзіркі ў скурах. Спэцыяльны работнік па падрыхтоўцы фарбы **т. Сапер** да пачатку кампэрэнцыі не правяраў, як красільшчыкі выдаткоўвалі фарбу.

Пачын штодзёнкі аддзелачнага аддзяленьня першага хромавага цэху падхапілі ўсе штодзёнкі «Бальшавіка». Падрыхтоўку да скліканьня кампэрэнцыі ўзначаліла шматтыражка «Рабочае вока». Партыйны калектыў, завком і дырэкцыя пачалі ўсёй рабоце на падрыхтоўцы кампэрэнцыі характар масавай кампаніі.

Штодзёнкі «Бальшавіка» ў сваіх цумарох бічуюць лодыра і бракароба, паказваюць лепшы вопыт работы асобных рабочых-ударнікаў.

На складзе сырцу таксама выходзіць штодзёнка (рэдактар **Любэрман**). Вялікую работу яна правяла па барацьбе за фінплян. Рэдкалегія арганізавала стол даведак па праверцы аблігацый усіх пазык. Некаторыя рабочыя па сваіх аблігацыях выйгралі яшчэ ў першых тыражох і толькі дзякуючы сталу даведак, яны даведаліся аб выйгрышах.

На старонках штодзёнкі другога хромавага цэху (рэдактар **Плісан**) выступаюць парторгі, абменьваюцца вопытам сваёй работы. Арганізаваная пераклічка партгруп дала адпаведную карысьць. Партвучоба ў гэтым цэху праходзіць значна лепш, чым у астатніх. Ініцыятыва штодзёнкі другога хромавага цэху была падхоплена ня толькі ўсімі штодзёнкамі «Бальшавіка», але і ўсімі фабрычна-заводзкімі газэтамі БССР.

Каштоўны пачын, добрая ініцыятыва—усё гэта вынік добрага парткіраўніцтва нізавым друкам і рабкорамі. **Рабкоры «Бальшавіка» зьяўляюцца лепшымі ўдарнікамі ў цэху.**

Тав. **Гурзвіч**—герой першай пяцігодкі. Ён пры пераглядзе норм і расцэнак высунуў прапанову павысіць норму на 30 проц. Прапанова яго была прынята адпаведна. **«Выпрацоўку лепшага ўдарніка—усім рабочым гарбарні»**,—так патрабавалі ўдарнікі, так і зроблена.

Тав. **Гефэн**—герой працы, герой першай пяцігодкі, актыўны рабкор шматтыражкі «Рабочае вока».

Тав. **Люблімэрмам**—герой першай пяцігодкі. Ударнік па сартыроўцы сырцу, ён-жа рэдактар штодзёнкі і актыўны рабкор заводзкай шматтыражкі.

Рабкоры **Ароцкер**, **Кажушка** паказваюць лепшыя прыклады на рабоце. Ароцкер—герой першай пяцігодкі. Кажушка—лепш за ўсіх усвоіў праграму партшколы на зімовай вучобе і ён, як качагар, у сваёй рабоце мае вялікую эканомію апалу.

Партыйны калектыў гарбарні «Бальшавік» ня спыняецца на дасягнутым. 5 мая па ўсіх цэхах праведзены спэцыяльна аб дні друку гутаркі з рабочымі. Шматтыражка арганізавала выстаўку штодзёнак. Адначасова на гарбарні арганізоўваецца ўзаемная самаправерка работы штодзёнак і насьценгазэт.

Ня дрэнна працуе нізавы друк і на заводах імя **ВАРАШЫЛАВА** і **«КАМУНАР»**. На заводзе імя Варашылава—400 рабкораў. Кожны рабочы-ўдарнік—рабкор сваёй шматтыражкі. Што дзёнак на заводзе імя Варашылава за раз 20. Лепшыя з іх: штодзёнка трэцяй групы такарнага цэху (рэдактар **Мінц**), штодзёнка другой групы такарнага цэху (рэдактар **Яглейка**) і інш. Няма такога рабкора на заводзе, які-б ня выконваў свайго прамфінпляну. Асобныя таварышы выконваюць свой прамфінплян на 120-140 проц. Да такіх можна аднесьці т. т. **Яглейка, Амбражэвіч, Сьцефанюк, Чарнякова, Рубінштэйн, Пагоскага** і інш.

Вынікам ударнай работы і штодзёнкі і рабкораў такарнага цэху зьяўляецца яшчэ і тое, што імі выкананы свой сацыялістычны абавязак да першамайскіх дзён. Сабекошт зьніжан на 170 руб.

Брыгада торфпрэсаў да 1 мая дала 25 адзінак. Торфпрэсы выйшлі лепшай якасьці. Гэта таму, што насьценгазэта ўвесь час змагалася, каб ні адна дэталь ня ішла ў зборку без праверкі.

Шматтыражка **«ВАРАШЫЛАВЕЦ»** на сваіх старонках, апрача паказу лепшых, арганізавала «калёнкі ганьбы». На гэтай калёнцы красуюцца прагульшчыкі, што зрываюць выкананьне прамфінпляну **(Нагорны, Блёх** і інш.).

Асабліва вялікая работа праведзена нізавым друкам і штодзёнкамі па выяўленьні клясава-чужых элемэнтаў у сваім каапгасе. Там выяўлены клясава-чужыя элемэнты **Шпанік, Шупэйка, Паляшук, Казюкевіч, Клепартанэр, Вайпфэндар** і інш. Усе яны адразу-ж выключаны з каапгасу.

14 штодзёнак і каля 200 рабкораў ёсьць на машынабудаўнічым заводзе **«КАМУНАР»**. Шматтыражка мае чым ганарыцца. Вакол сябе яна згуртавала ўсіх рабочых, якія атрымалі годнасьць героя першай пяцігодкі. І таму няма нічога дзіўнага ў тым, што кавальскі цэх, напрыклад, прамфінплян першага кварталу выканаў на 103 проц., а прамфінплян за красавік выканан на 112 проц. Рэдактар штодзёнкі ў гэтым цэху тав. **Рубенчык** зараз так гаворыць:

— У нашым цэху менш 100 ніколі ня будзе. Мы заўсёды будзем перавыконваць свой прамфінплян.

— Правільна!—тут-жа падтрымалі яго рабкоры **Рольбін, Каланіцкі, Галубоўскі, Зьбічынскі** і інш. Рабочы Зьбічынскі мае больш за 50 год, але ён працуе лепш чым іншы малады. **Зьбічынскі, Некраш, Ганчаронак, Тэйтэльман, Гарбацэвіч** і інш.—усе яны лепшыя ўдарнікі на заводзе, лепшыя рабкоры шматтыражкі.

* * *

Зараз, пачынаючы месячнік друку, трэба, каб партыйныя арганізацыі фабрык і заводаў БССР, на прыкладзе «Бальшавіка», «Камунар» і заводу імя Варашылава ўзмацнілі кіраўніцтва нізавым друкам.

Кожная шматтыражка заводу, фабрыкі, кожная штодзёнка цэху, брыгады павінна адзначыць і правесьці гэты месячнік узмацненьнем сваёй работы.

В. Стальноў.



У капіталістычных краінах друк дапаможная зброя крывавага тэрору

РАСЬЦЕ КАЛГАСНЫ ДРУК

Певнікую колькасьць матар'ялаў мы маем на сёнешні дзень аб рабоце нізавога друку ў раёнах дзейнасьці МТС, але і наяўны матар'ял гаворыць нам аб тым, што палітаддзелы прарабілі значную работу па ўзьнёсьці баяздольнасьці насьценных газэт.

Не гаворачы ўжо аб колькасным і якасным росьце насьценных газэт у калгасах і калгасных брыгадах, у радзе раёнаў пачалі выходзіць друкаваныя і шклографічныя шматтыражкі і бюлетэні пры МТС. У Пухавіцкім раёне 11-га мая выйшаў ужо другі нумар бюлетэню РК БП(б)Б і палітаддзелу МТС (друкуецца на шклографе) і ў Дзяржынскім раёне 13 мая выйшаў другі нумар друкаванага бюлетэню, які выпускаецца газэтамі «Орка» і «Штурмавік Дзяржыншчыны» пры Путчынскай МТС. У некаторых раёнах (Дрыса, Горкі і інш.) арганізаваны агульна-МТС'аўскія насьценгазэты. Усе гэтыя бюлетэні і газэты—пачатак арганізацыі пастаянных газэт пры палітаддзелах МТС і саўгасаў.

ЦК УсеКП(б) прызнаў неабходным на працягу бліжэйшых трох месяцаў арганізаваць новых 700 шматтыражак пры палітаддзелах МТС і саўгасаў. Неабходна, каб партыйныя арганізацыі, рэдакцыі газэт, друкарні аказалі неабходную дапамогу ў арганізацыі і ўзмацненьні гэтых шматтыражак.

У сваім лісьце («Правда» № 122) дэлегацыя рабочых ударнікаў Балахны пісала: «Стварэньне палітаддзелаў у саўгасах і МТС адкрывае вялізарныя, нябывалыя магчымасьці для якаснага і колькаснага росту і ўзмацненьня саўгаснага і калгаснага друку. У руках палітаддзелаў шматтыражкі будуць выключна вострай зброяй партыі, зброяй барацьбы за поўнае ажыцьцяўленьне праграмных указаньняў тав. Сталіна аб рабоце на вёсцы, супроць апартуністаў, кулакоў, лодыраў, раскрадвальнікаў сацыялістычнай уласнасьці і ўсіх ворагаў калгаснага ладу, за бальшавіцкія калгасы, за ператварэньне ўсіх калгаснікаў у заможных».

Ударнікі Балахны ўзялі на сябе абавязацельства, у парадку шэфства даць паперу на выпуск шматтыражак. З балахнінскіх ударнікаў павінны ўзяць прыклад Добруская фабрыка і іншыя арганізацыі нашай рэспублікі.

* * *

Мы ўжо вышэй адзначылі, што пад кіраўніцтвам палітаддзелаў нізавы друк значна ўзьняў сваю ролю ў барацьбе за выкананьне плянаў веснавой сяўбы, за сацыялістычнае перавыхаваньне калгаснікаў, за ачыстку калгасаў ад клясава-варожых элемэнтаў.

Так, у адным з сельсаветаў Дрысенскага раёну работнікамі нізавых газэт і селькорамі арганізавана выстаўка браку, куды селькоры прыносяць часткі зламаных машын, гнілы лён і іншыя экспанаты і на кожным экспанаце паказваюцца прозьвішчы вінаватых у шкодніцтве і абураючых адносінах да аховы калгаснай маемасьці.

Селькоры-ўдарнікі друку ў калгасе **«Камінтэрн»** (раён дзейнасьці палітаддзелу Дзяржынскай МТС) сумесна са сваімі шэфамі арганізавалі начны рэйд па праверцы аховы калгаснай маемасьці і догляду коняй у начны час. Удзельнікі рэйду пабывалі па стайнях, у сьвірнах, цялятніку, кузьні і выявілі, што шмат па якіх важнейшых вучастках яшчэ арудуюць кулацкія элемэнты. Селькоры ўзьнялі гэтыя пытаньні на старонках газэты і пад кіраўніцтвам палітаддзелу дабіваюцца ачысткі свайго калгасу ад кулакоў.

Шмат у якіх калгасах і сельсаветах шырока ўжываецца выпуск сьветавых газэт. 6 мая ў калгасе «Сталінскі заклік», Путчынскага сельсавету (Дзяржынскі раён), быў арганізован вечар. Рэдактар сьветавой газэты т. **Кажанеўскі** дэманстраваў на экране капкрэтныя прыклады клясавай барацьбы ў сваім калгасе. Газэта выкрывала новую тактыку клясавага ворага: тут быў паказан і Ценчвіцкі, які агітуе калгасьнікаў ня выходзіць на работу, тут і кулак Гронскі, які на просьбу дапамагчы падняць хворага каня, адказаў: «няхай здохне, а я дапамагаць ня буду». Газэтай быў выкрыт падкулачнік Васілеўскі, які пакінуў коняй на поле, а сам пашоў да дому.

Каб адпомсьціць рэдактару сьветавой газэты, кулацкая грушка на гэтым-жа вечары накінулася на т. Кажанеўскага і пачала яго зьбіваць.

Мы ня сумняваемся ў тым, што пралетарскі суд вынесе суровае рашэньне і дасьць жорстка па руках тым, хто прабуе нападаць на актывістаў-калгасьнікаў, на адданых сельскораў. Нізавы друк і селькоры Дзяржынчыны адкажуць на вылазку клясавага ворага яшчэ большым узмацненьнем сваёй рэвалюцыйнай пільнасьці, узьняцьцем барацьбы супроць кулака, за пасьпяховае завяршэньне веснавой сяўбы.

* * *

Нізавы друк у барацьбе з клясавым ворагам загартаваўся і палітычна вырас. Маленькая насьценгазэта калгаснай брыгады пачынае правільна разумець свае задачы, разумець тое, што яна павінна выхоўваць калгасьніка ў сацыялістычным духу, у духу задач міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. Рад насьценных газэт зразумелі, што яны павінны ўкараніць у сьвядомасьць калгасьніка і калгасьніцы, што іх барацьба за бальшавіцкую сяўбу, за высокі ўраджай, за ўмацаваньне калгасаў — узмацняе краіну дыктатуры пралетарыяту, набліжае сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

Перад намі ляжыць першамайскі нумар насьценгазэты **БРЫГАДЫ № 6** таго-ж самага калгасу «Камінтэрн». У перадавым артыкуле газэта піша: «Калі рабочыя і працоўныя ўсіх капіталістычных краін выходзяць першага мая на вуліцы пад лёзунгам барацьбы супроць фабрыкантаў і памешчыкаў, за пралетарскую рэвалюцыю, за абарону СССР,—мы ў гэты дзень змагаемся за выкананьне і перавыкананьне нашых плянаў, за датэрміновае сканчэньне сяўбы. Гэтым мы вядзем барацьбу за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю, бо кожнае наша дасягненьне ў галіне будаўніцтва сацыялізму, якое праходзіць у жорсткай клясавай барацьбе супроць недабітых яшчэ рэштак кулацтва, набліжае сусьветную рэвалюцыю і вызваленьне рабочых і працоўных сялян усяго сьвету ад капіталістаў».

Нізавыя газэты ў калгасах ужываюць розныя формы і мэтады работы, мабілізуюць усе людзкія сілы на тое, каб павысіць ураджайнасьць сацыялістычных палёў і захаваць ураджай.

Трэба адзначыць, што ў радзе вёсак, сельсаветаў і калгасаў слаба вядзецца барацьба за захаваньне пасеваў; патравы прыносяць падзвычай вялікія страты калгасам. У барацьбе з патравамі заслугоўвае сур'ёзнай увагі ініцыятыва палітаддзелу дзяржынскай МТС, які мабілізуе пінэраў і школьнікаў на практычнае выкананьне гэтай задачы. Вучні дзяржынскай ШКМ, падхапіўшы прапанову палітаддзелу аб арганізацыі масавага паходу на барацьбу за ахову пасеваў узялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў:

«Мы ўстанаўляем 7 кантрольных вартавых пастоў па калгасу «Камінтэрн» для барацьбы з патравамі (так пішуць у газэце вучні дзяржынскай школы). Арганізуем для гэтай мэты навакол сябе ўсіх дзяцей.

— Не дапускаць рабіць сьцежак на палёх па пасевах...

— Ніводнага пінэра і вучня не павінна застацца, які-б ня прымаў удзелу у актыўнай барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці калгасных палёў».

Вакол нізавога друку выхаваўся і выхоўваецца новы селькораўскі актыў, які вылучае са сваіх радоў мастакоў-карыкатурыстаў і паэтаў.

Вось, напрыклад, у насьценгазэце **«ЗА ЎДАРНУЮ РАБОТУ»**, калгасу **«Перамога»** (Пухавіцкі раён) селькор піша:

«За ўдарную работу
Мы бярэмся сьмела.
Чорны Гаўрык у ахвоту
Сыпіць на працы сьмела.
Больш гарэлкі так ня піць —
Якаву парада,
Рана з працы вельмі едзе
З ворыва брыгада.
Ужо калгасныя палі
Працай закіпелі,
Мы спаборніцтва ўзялі
Скончыць—у дзьве нядзелі.
Але-ж гэта ўсё забыў
Камсамолец Сьцёпа,
На вялікадня прыбыў
П'яны, як растропа.
Мы, ударнікі палёў,
Аб'явілем сьмела:
Супроць п'яніц, гультаёў
І людзей бяз дела».

«Правда» ў сваім агляде друку (№ 115) пра гэтых паэтаў і вершы ў насьценгазэтах пісала: **«У гэтых вершах не заўсёды супадае рытм, моцна кульгае рыфма, нават граматыка ў паэта не заўсёды ў пашане, але хто можа адмаўляць выразны па літычны зьмест гэтых вершаў, іх баявую апэрацыйнасьць?»**

У калгасе **«Зьвязда»** (Дзяржынскі раён) селькор-карыкатурыст сваёй карыкатурай трапна і моцна б'е па лодыру, па нядбайнасьці і г. д. Рэдкалегія, апрача насьценгазэты, час ад часу выпускае спэцыяльныя нумары **«БАЛЬШАВІЦКІМ ВОКАМ ПА БРЫГАДАХ КАЛГАСУ»**.

Баявая работа насьценгазэты і селькораў сумесна з усімі калгасьнікамі дала магчымасьць калгасу «Зьвязда» атрымаць ганаровы сьцяг за своечасовую падрыхтоўку да веснавой сяўбы, а таксама сканчыць сяўбу збожжавых культур да 11 мая.

* * *

Мы прывялі толькі некалькі прыкладаў барацьбы паасобных насьценгазэт за посьпех веснавой сяўбы. Гэтыя прыклады можна было-б павялічыць. Ёсьць, бязумоўна, у рабоце нізавога друку і рад недахопаў і памылак. І зусім зразумела, што нізавы друк зможа больш пасьпяхова справіцца з вялікімі задачамі, ускладзенымі на яго партыяй, толькі тады, калі яму будзе аказвацца **ПАСТАЯННАЯ ДАПАМОГА** з боку партыйных арганізацый і ў першую чаргу з боку палітаддзелаў саўгасаў і МТС.

Б. Шпітальнік.

ДРУК РЭВАЛЮЦЫНАГА ПАДПОЛЬЛЯ

(Агляд нелегальнага камуністычнага друку)

Камуністычная партыя Заходняй Беларусі вядзе ўпартую барацьбу з наступленьнем фашызму і яго акупацкай палітыкай, арганізоўвае працоўныя масы ЗБ на барацьбу за пралетарскую рэвалюцыю.

У гэтай барацьбе КПЗБ шырока скарыстоўвае, як вострэйшую бальшэвіцкую зброю — друк.

Нелегальны друк, які выдае КПЗБ (часопісі «Партработнік», «Бальшавік», газэты «Чырвоны сьцяг», «Малады камуніст», «До вальки», адозвы, брашуры і інш.), — гэта баявы камуністычны агітатар і арганізатар мас для пралетарскай рэвалюцыі на ЗБ — сустаўной часткі пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы. Роля і значэньне гэтага друку сярод шырокіх працоўных мас узмацняецца з кожным днём. Масавыя, напісаныя рукамі саміх рабочых і сялян, карэспандэнцыі з усіх куткоў Заходняй Беларусі, якія мы знаходзім на старонках гэтага друку, сьведчаць аб яго вялізарнай папулярнасьці.

У гэтых карэспандэнцыях рабочыя і працоўныя сяляне апісваюць сваё становішча, зьдзекі фашысцка-акупацкай улады.

«... на Заходняй Беларусі ад часу вялікай імпэрыялістычнай вайны ня было яшчэ такой галоднай, такой цяжкай для рабочага і селяніна вясны, як вясна гэтага году. Наскрозь прагніпая капіталістычная гаспадарка з цяжкім крызісам, які цягнецца некалькі ўжо год і якому канца ня відаць, сее навокал голад, нэндзу, руіну, тыфус і іншыя хваробы, як у горшыя часы вайны.

Беспрацоўныя і напаўбеспрацоўныя ўжо не спадзяюцца, што вясенні сэзон дасьць ім працу. Сельска-гаспадарчым рабочым красавік прынесьці, як штогод, зноў горшыя ўмовы працы, звальненьні, эксмісіі. Большая частка сялянства ўжо са сьнежня сядзіць бяз хлеба».

Але задача большавіцкага друку — ня толькі паказваць становішча працоўных мас, ня толькі агітаваць, але і арганізоўваць масы на барацьбу з капіталізмам. І падпольны друк КПЗБ арганізуе рабочых і працоўнае сялянства на барацьбу з акупацка-фашысцкім рэжымам, высоўвае канкрэтныя задачы гэтай барацьбы, вучыць як трэба яе арганізаваць.

Гаворачы аб забастоўцы тэкстыльшчыкаў Беластоку, «Партработнік» ставіць перад партарганізацыяй канкрэтныя задачы:

«Трэба падняць актыўнасьць парт арганізацыі, цясьней зьвязацца з тэкстыльнымі фабрыкамі, узмацніць барацьбу за апанаваньне прафсаюзу, няшчадна дэмаскуючы штрэйкбрэхэрства сацыял-фашысцкіх правадыроў, разгарнуць шырокую, адзінафрантовую акцыю для падрыхтоўкі да новых баёў, да адпору бязупынных атак фабрыкантаў... Мы павінны здолець разгарнуць ініцыятыву і рэвалюцыйную энэргію тэкстыльшчыкаў, якія атрымалі баявое хрышчэньне ў забастоўчай барацьбе і замацавалі сваю адданасьць справе рэвалюцыйнай барацьбы ўступленьнем ў партыю». («Партработнік» № 2, 1933 г.).

Апісваючы апошнюю забастоўку рабочых Белавескай Пушчы, часопісь заклікае ўвесь партыйны і камсамольскі актыў вучыцца на ўзоры гэтай забастоўкі.

«Белавэская стачка мае вялікае значэньне для рэвалюцыйнага руху ўсёй ЗБ. Яна непасрэдна ўзварушыла сялянскія масы, пацягнула да стачачнай барацьбы сялян-возчыкаў з дзесяткаў вёсак Пружаншчыны і Спонімшчыны, стапася непасрэдным выразам гегемоніі пралетарыяту ў сялянскім руху. Гэта значэньне белавескай стачкі партыя павінна далей паглыбляць, папулярызуючы ў масах гэту гераічную барацьбу».

Голад, галеча і нацыянальны ўціск шырокіх пластоў насельніцтва заходня-беларускай вёскі выклікаюць рост незадаволенья і бурныя хваляваньні сярод працоўнага сялянства. Гэта знаходзіць жывы водгук у нелегальным камуністычным друку, які заклікае і арганізуе працоўнае сялянства да барацьбы з голадам, падаткамі, тэрорам, фашысцкай зямельнай рэформай.

«Годзе гібець з голаду ў той час, калі дабро, здабытае нашымі крывавымі мазалямі, марнее па сховах-складах магнатаў (буйных абшарнікаў — Рэд.) Тышкевічаў, Скірмантаў, Плятараў і інш.

Масава, усёй грамадой, разам з парабкамі, пад кіраўніцтвам сваіх камітэтаў — падзьма захоп абшарніцкіх сьвірнаў, капцоў бульбы і падпал збожжа, бульбы паміж галадаючымі.

Да масавай арганізаванай барацьбы за хлеб і насеньне». («Чырвоны сьцяг» № 1, 1933 г.).

У пытаньні барацьбы з фашысцкай зямельнай рэформай КПЗБ праз свой друк выкрывае яе клясавую сутнасьць і дае прыклады барацьбы з ёю.

«Фашысцкія ўлады, абшарнікі і кулакі стаяць за камасацыю, бо яны хочуць прыбраць сабе лепшую зямлю, хочуць распарушыць вёскі на хутары, каб распаліць па адзіночцы, каб лягчэй было памаць непакорлівасьць, лягчэй ганяць на шарварні, спаганяць падаткі, наогул кажучы, закабаляваць працоўных сялян...

Там, дзе камасацыя пачынае праводзіцца, трэба ўсямерна не дапускаць зрываць яе правядзеньне, як гэта прыкладам было ў вёсках Завадзічы, Чапляёва і інш., дзе праганялі фашысцкія ўлады, каморнікаў і дапамагаючых ім кулакоў, адмаўляліся ісьці на работу, выкопвалі капцы... Трэба арганізаваць агульнае адмаўленьне ад пераходу на хутары, не пераносіць будовы на новыя месцы, зьніштажаць граніччныя знакі, заворваць новыя межы, кулацкія пасевы і г. д.». («Чырвоны сьцяг» № 1, 1933 г. і «Малады камуніст» № 2, 1933 г.).

У той час, як «Чырвоны сьцяг» і «Малады камуніст» заклікаюць масы да адпору фашысцкай зямельнай рэформе, «Партработнік» дае канкрэтныя ўказаньні, як камуністы павінны арганізоўваць гэту барацьбу.

«Задача партарганізацыі — распаліць незадаваленьне сялян камасацыяй і накіраваць яго ў рэчышча масавай арганізаванай барацьбы». («Партработнік» № 2, 1933 г.).

У адказ на карныя экспэдыцыі, якімі фашызм імкнецца задушыць барацьбу працоўнага сялянства, КПЗБ праз свой нелегальны друк заклікае да арганізацыі масавага адпору, масавай барацьбы супроць гэтых экспэдыцый.

Гэтыя заклікі знаходзяць жывы водгук сярод працоўнага сялянства Польшчы. Яны выяўляюцца ў росьце рэвалюцыйнага ўздыму, у масавай барацьбе сялян цэлых паветаў з карнымі экспэдыцыямі. Вось некалькі прыкладаў гэтай барацьбы:

«У вдказ на карную экспэдыцыю ў Баранаве з 25-XI—32 г., у Індурскім раёне ўжо з 25 на 26 у 5 мясцовасьцях былі скліканы масоўні, на якіх прысутнічала каля 220 чалавек і прынят цэлы шэраг рэвалюцыйных пратэстаў супроць тэрору. У той-жа дзень было вывешана 16 трэспарантаў з лёзунгамі супроць тэрору і г. д. У Індурскім і Алекшыцкім раёнах Гарадзеншчыны адбылося звыш 20 сялянскіх сходаў, на якіх былі прыняты рэзалюцыі пратэсту супроць карных экспэдыцый у Баранаве і супроць працэсу Тарашкевіча». («Чырвоная дапамога» № 1, 1933 г.).

Арганізуючы рабочых і сялян на барацьбу з фашызмам, камуністычная партыя праз свой друк праводзіць адначасова паказ вялізарных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва СССР і гэта знаходзіць жывы водгук сярод рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Польшчы. Ён выяўляецца ва ўздыме клясавай барацьбы, у росьце сымпатый працоўных мас да СССР, і БССР.

«... Сялянства цалкам настроена ў карысьць Савецкага саюзу. (Зразумела, не кулакі). Чуткі аб калектывізацыі прасочваюцца да нас і выклікаюць з боку ўсёй беднаты добры водгук.

У Тараспольні пастанавілі 200 дзесяцін зямлі забраць у кулакоў (даўней — сэрвітут) і пабудаваць калгас. На сходзе выбралі праўленьне калгасу...». («Бальшавік» № 5, 1933 г.).

Польскі фашызм і імпэрыялісты іншых краін добра разумеюць пагрозу, якую стварае гэты рост сымпатый да СССР, і таму ўзмоцненая падрыхтоўка інтэрвэнцыі супроць СССР выяўляецца неадлучнай часткай барацьбы польскага фашызму супроць рэвалюцыйнага руху. Але гэту падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР шырока выкрывае кампартыя і яе друк.

Верныя лёкаі буржуазіі — нацыянал і сацыял-фашысты — усімі сіламі стараюцца выратаваць буржуазны лад ад надыходзячай пралетарскай рэвалюцыі. Яны стараюцца адурманіць працоўныя масы, адцягнуць іх ад рэвалюцыйнай барацьбы. Камуністычная партыя праз свой друк выкрывае ўсе махінацыі нацыянал-фашыстаў, паказвае масам іх сапраўдны твар і заклікае да рашучай барацьбы з імі, да арганізацыі адзінага фронту пад сьцягамі кампартыі.

«У Вільні беларускім нацыянал-фашыстоўскім студэнцтвам выдаецца часопісь пад назвай «Шлях моладзі». Усе яўрэі гэтай плюгавенькай часопісьсю называюцца гандлярамі, вшуканцамі, эксплёататарамі. Таму ня можа быць нічога супольнага паміж беларусамі і яўрэямі. Мэта антыяўрэйскага выпаду «Шляху моладзі» ясная. Гэта нацкоўваць беларускія масы на яўрэяў.

Трэба гнаць вон нацыянал-фашыстоўскіх брахуноў, якія стараюцца пасеяць нянавісьць паміж беларускімі, яўрэйскімі, польскімі і іншымі працоўнымі. Нашым лёзунгам павінен быць лёзунг інтэрнацыянальнай еднасьці ўсіх працоўных». («Малады камуніст» № 2, 1933 г.).

Крывавы тэрор, зьверскія расправы над удзельнікамі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, насаджэньне ваенных асаднікаў на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, крывавыя карныя экспэдыцыі і надзвычайныя суды — усё гэта мерапрыемствы польскага фашызму па падрыхтоўцы тылу для ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР.

Мноства фактаў зьверската зьбіваньня палітвязьняў у турмах і фашысцкіх дэфэнзывах мы знаходзім на старонках камуністычных газэт.

«Ня раз здараюцца выпадкі зьбіваньня палітвязьняў. Мардаваньне, катаваньне, карцэр — штодзённыя зьявішчы ў казэматах берасьцейскай турмы. Сам начальнік тэрарызуе і б'е палітвязьняў...

У 1931 годзе судзілі ў парадку даразьных (ваенна-палявых — А. Н.) судоў 54 асобы, у 1932 — 251, прычым у 1931 годзе асуджана на кару сьмерцю 29 асоб, а ў 1932 г. — 120 асоб». («Чырвоная дапамога» № 1, 1933 год).

Аднак, усімі гэтымі спосабамі фашызму ня ўдасца задушыць рэвалюцыйны рух, які ахапляе ня толькі рабочых і працоўнае сялянства, але і прасякае ў армію. Дакрэт аб увядзеньні палявых судоў у войску зьяўляецца адказам фашызму на рэвалюцыянізаваньне салдацкіх мас. Аднак, і расстрэлы ня могуць устрымаць рэвалюцыйнай барацьбы ў польскім войску. Факты пратэсту салдат і заклік, надрукаваны ў камуністычнай прэсе, ярка сьведчаць аб гэтым.

«У адным палку афіцэр пабіў салдата за тое, што адно крэсла ўпала са сходаў. Усе салдаты разам дружна пачалі крычаць, голасна пратэставаць супроць біцьця, з патрабаваньнем арышту афіцэра. Палкоўнік прымушан быў абяцаць арыштаваць афіцэра».

Далей газэта заклікае:

«Не страляйце ў клясавых братоў, а братайцеся з імі. Памятайце, што зброю, якую дае вам у рукі буржуазія з мэтай выкарыстаньня супроць рабочых і сялян, супроць СССР, краіны сацыялізму і яе рабоча-сялянскай арміі, мы павінны накіраваць супроць буржуяў, абшарнікаў і іх фашыстоўскага ўраду Пілсудзкага». («Малады камуніст» № 2, 1933 г.).

Толькі праз рэвалюцыйную барацьбу, праз завяваньне пралетарскай дыктатуры ідзе шлях да вызваленьня працоўных ад панаваньня капіталу і фашызму. Камуністычная партыя Польшчы і Заходняй Беларусі вядзе працоўныя масы па гэтым шляху і праз свой друк мабілізуе іх на барацьбу з фашызмам.

ВОДГУКІ НА ДЭКЛЯРАЦЫЮ ГІТЛЕРА

Непераконваючыя словы

Лёндан і Парыж незадаволены

ЛЁНДАН, 18. (БЕЛТА). У лёнданскіх палітычных колах заяўляюць, што прымірэнчы тон прамовы Гітлера не зьявіўся нечаканасьцю. Застаецца, аднак, пагледзець, ці пасьледуюць за прамовай прымірэнчыя крокі германскай дэлегацыі ў Жэнэве. Прамова Гітлера не змяшчае ўказаньняў на зьмену германскай лініі паводзін у генэральнай камісіі канфэрэнцыі па разьбраеньні.

Гэты пункт погляду адлюстроўвае і друк, які, аднак, ня скуплюцца на перасьцярогі Германіі.

У фінансавых колах Лёндану думаюць, што прамова Гітлера павялічыла германскія шанцы дабіцца ўступак у падыходзячых перагаворах рэйхсбанку з замежнымі крадыторамі Германіі.

***

ПАРЫЖ, 18. (БЕЛТА). Францускі друк сустрэў прамову Гітлера спрымана і скептычна. Умяранасьць тону прамовы тлумачаць тым, што Германія адчула сваю ізаляцыю на міжнароднай арэне. Разам з тым частка друку адзначае, што Гітлер па сутнасьці захоўвае ў сіле патрабаваньні Германіі.

Пэртынакс у «Эко дэ Пары» заўважае, што часова дэмагог уступіў месца дыплёмату, але што ў асноўным тэзіс роўнапраўя захаван у поўнай сіле. Бліжэйшыя 5 год павінны разглядацца, як пробны тэрмін, па працягу якога Францыя павінна будзе меркаваць аб сапраўдных намерах Германіі, а таксама аб сапраўднасьці кантролю над узбраеньнямі і жэрлае аб санкцыях.

«Пці журналь» піша, што ў прамове Гітлера шмат абяцаньняў. Францыя хацела-б, аднак, убачыць іх ажыцьцяўленьне. «Гітлер,—гаворыць газэта, — не павінен крыўдзіцца, калі мы просім іншых членаў Лігі нацый прафуглядзець санкцыі на выпадак парушэньня міру тэй ці іншай краінай».

«Ом лібр» заўважае: «Мы хочам гарантый. Няхай Гітлер нам цяпер іх дасьць. Мы будзем чакаць яго дзеяньняў».

***

ВАШЫНГТОН, 17. (БЕЛТА). У дзяржаўным дэпартаманце прамову Гітлера лічаць «прымірэнчай». Выказваюць думку, што жэнэўскія перасьцярогі паленьміліся і што Германія намерана дабівацца зьмены версальскага дагавору толькі мірнымі сродкамі.

„Мы не вінаваты"

Германскі друк аб выступленьні Гітлера

БЭРЛІН, 18. (БЕЛТА). Германскі друк указвае, што задача выступленьня Гітлера заключалася ў тым, каб пераканаць адказасьць за магчымы правал Жэнэвы на іншыя краіны, асабліва на Францыю.

Найбольш выразна выказваецца «Дэйчэ Альгемэйне Цэйтунг»: «Прамова рэйхсканцлера бязумоўна ўстанавіла, што адказнасьць за магчымыя ўскладненьні і за працяжэньне напружанага становішча ў Эўропе ня пацае на Германію. Моцна ўзброеныя ваенныя дзяржавы-пераможцы Версалю маюць, нарэшце, магчымасьць вяртуць мір змучанаму кантынэнту».

У тым-жа духу выказваюцца і «Франкфуртэр Цэйтунг», «Фосышэ Цэйтунг», «Германія» і інш.

ПАЗШ ТЛУМАЧАЦЦА...

Папраўкі да звароту Рузвэльта

ВАШЫНГТОН, 17. (БЕЛТА). Няправільныя тлумачэньні дэкляраваньня Рузвэльта і перамавлічаныя думкі аб прыцятых ПАЗШ абазвацельствах прымушылі «Белы дом» (рэзыдэнцыя прэзыдэнта) апублікаваць больш дакладнае азначэньне абавязацельстваў, якія ПАЗШ гатовы прыняць на сябе.

«Асошыэйтэд прэс» перадае наступнае тлумачэньне «Белага дому»:

«1) Калі ўсе іншыя краіны згодзяцца скасаваць наступальныя віды ўзбраеньняў, дык ПАЗШ зробяць тое-ж самае; 2) калі на час дзеяньня згоды аб разьбраеньні ўсе іншыя краіны згодзяцца не накіроўваць сваіх узброеных сіл у суседнія краіны, паколькі гэта не прадугледжваецца дагаворнымі правамі, дык ПАЗШ зробяць тое-ж самае; 3) калі якая-небудзь з гэтых згод будзе парушана, ПАЗШ будуць прымаць удзел у кансультацыі з іншымі краінамі».

«Асошыэйтэд прэс» гаворыць: «Указваецца, што гэта палітыка кансультацыі не разглядаецца як зьмена ранейшай палітыкі ПАЗШ. Злучаныя Штаты захоўваюць поўную свабоду разьмяркоўвання і выкананьня палітыкі, якой яны будуць сьледаваць у сувязі з падобнай кансультацыяй. Зварот Рузвэльта не азначае, што ПАЗШ будуць кансультаваць з іншымі краінамі для вызначэньня сваёй палітыкі. Амэрыканскі ўрад будзе вызначаць пазыцыю ПАЗШ у залежнасьці ад абставін. Зварот Рузвэльта ня зьвязвае ПАЗШ у гэтых адносінах».

***

ВАШЫНГТОН, 17. (БЕЛТА). «Белы дом» атрымаў ужо ад 12 дзяржаў адказы, якія зьмяшчаюць пацьвярджэньне атрыманьня звароту Рузвэльта. Сярод адказаўшых — Англія, Францыя, Швэйцарыя, Данія, Швэцыя, Нарвэгія, Аўстрыя, Латвія і некалькі лацінскаамэрыканскіх рэспублік. У тэлеграмах англійскага караля і францускага прэзыдэнта гаворыцца, што зварот Рузвэльта перадан урадам на разгляд.

Амэрыканская інтэлігенцыя патрабуе прызнаньня Савецкага саюзу

НЬЮ-ЁРК, 18. (БЕЛТА). «Незалежны камітэт прызнаньня Савецкага саюзу» — грамадзкая арганізацыя, якая складаецца з выдатных амэрыканскіх навуковых дзеячоў, пісьменьнікаў, артыстаў, інжынэраў, — зьвярнуўся да Рузвэльта з тэлеграмай, у якой гаворыцца: «У сувязі з тым фактам, што вы ўступілі ў простыя зносіны з кіраўніком савецкай дзяржавы, камітэт патрабуе хутчэйшага прыняцьця лёгічна слядуючага за гэтым кроку — агаласіць фармальнае прызнаньне савецкага ўраду. Гэта значна павялічыла-б устойлівасьць міжнароднага становішча». У тэлеграме падкрэсьлівецца кіруючая роля савецкага ўраду ў справе заключэньня пактаў аб ненападзе.

На зьезьдзе шавіністычнай арганізацыі «сыны амэрыканскай рэвалюцыі» прынята рэзалюцыя супроць прызнаньня савецкага ўраду, пакуль апошні «не адмовіцца ад прапаганды».

Партовыя рабочыя Гдыні і Антвэрпэну адмаўляюцца разгружаць германскія параходы

Шалёны фашысцкі тэрор нацыянал-сацыялістаў у адносінах да германскіх рабочых выклікаў шырокую хвалю абурэньня і пратэсту прапетарыяту ўсяго сьвету. Магутныя мітынгі і дэманстрацыі сулроць фашысцкага тэрору ў Германіі адбываюцца штодзенна. Сёньня буржуазны друк прыносіць новыя весткі з антыфашысцкага фронту.

Польская сацыял-фашысцкая газэта «Роботнік» піша, што ў ГДЫНІ (Польшча), партовыя рабочыя, абураныя паводзінамі нацыянал-сацыялістаў у Данцыгу, ПАСТАНАВІЛІ НЯ ВЫГРУЖАЦЬ ГЕРМАНСКІХ СУДНАЎ. І калі ў Гдынскі порт прыбыў з Брэмэну германскі параход «СС Гектар» з грузам бавоўны, рабочыя адмовіліся выгружаць яго. Такі-ж самы пёс спаткаў германскае парусное судно «Марта» і параход «Альбінэ Рус».

Падобныя-ж «прывітаньні» сустракаюць германскія параходы ў бэльгійскіх партох. Як паведамляе ангельская «ТАЙМС», у АНТВЭРПЭНСКІМ ПОРЦЕ меў месца востры інцыдэнт у сувязі з прыбыцьцём германскага парахода «ВАТУС», які павінен быў у Антвэрпэне забраць пэўны груз.

З прычыны таго, што гэты параход плыў пад гітлераўскім сьцягам, рабочыя не захацелі прыступіць да яго загрузкі, патрабуючы зьняць фашысцкі сьцяг. Паміж рабочымі і матросамі германскага параходу ўзьнікла вострая спрэчка, якая пагражала ператварыцца ў бойку. Для аховы парахода быў выкліканы атрад паліцыі. Усе ўгаворы германскага генэральнага консула, які прыбыў у порт каб угаварыць рабочых, ня мелі ніякага выніку. Параход вымушан быў адплыць без прызначанага для яго грузу.

Такі-жа выпадак меў месца і з іншым параходам германскай лініі Гамбург-Амэрыка, якому рабочыя перашкодзілі выгрузіць тавары, прызначаныя для Антвэрпэну.

(Уласн. інфар.).

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Адказ старшыні ЦВК СССР тав. М. І. Калініна на зварот прэзыдэнта ПАЗШ п. Франкліна Рузвэльта

Прэзыдэнту Злучаных Штатаў Амэрыкі—Франкліну д-ру Рузвэльту

Пацьвярджаю атрыманьне вашага звароту да дзяржаў аб устанаўленьні палітычнага і эканамічнага міру. Упэўнен, што ён сустрэне гарачы водгук сярод народаў Савецкага Саюзу.

Выказваючы волю народаў СССР, савецкі ўрад на працягу звыш 10 год на ўсіх міжнародных канфэрэнцыях, у якіх ён прымаў удзел, не пераставаў зварачаць увагу на неабходнасьць усеагульнага разьбраеньня, як на прадпасылку забесьпячэньня міру паміж народамі. Савецкі ўрад сам прапанаваў і падтрымліваў у Жэнэве канкрэтныя праекты ўсеагульнага разьбраеньня і ахватней за ўсё такія, якія прадугледжвалі максімальнае скарачэньне ўзбраеньняў, выкрываючы разам з тым недапушчальныя спробы дыскрэдытацыі ідэі разьбраеньня і скарыстаньня яе ў інтарэсах нацыянальнай палітыкі адных краін супроць другіх.

Савецкі ўрад таксама прапанаваў і падтрымліваў меры, якія мелі на мэце зрабіць немагчымымі, або хоць-бы максімальна затрудніць ўсякага роду агрэсіі ці спробы адных народаў пашырыць свае тэрыторыі за кошт другіх. Савецкі ўрад заключыў пакты аб ненападзе з большасьцю краін, з якімі ён знаходзіцца ў афіцыяльных зносінах, і таму ён можа толькі вітаць вашу прапанову аб заключэньні пакту аб ненападзе з усімі краінамі.

Тое-ж самае трэба сказаць і пра палітыку савецкага ўраду ў адносінах эканамічнага міру. Ён, як вядома, прапанаваў у Жэнэве пакт эканамічнага ненападу, выходзячы з эканамічнай узаемазалежнасьці зносін усіх кантынэнтаў. Як ваенны, так і эканамічны напад адной краіны на другую вядзе не інтарэсы ня толькі гэтых дзьвёх краін але і ўсіх іншых краін, узмацняючы існуючы эканамічны хаос.

Савецкі ўрад намеран і надалей пра цягваць свае намаганьні ў духу гэтай палітыкі. Ён ахвотна будзе супрацоўнічаць з урадамі, зацікаўленымі ў ажыцьцяўленьні такой палітыкі як на жэнэўскай канфэрэнцыі па разьбраеньні, так і на пёнданскай эканамічнай канфэрэнцыі.

М. І. КАЛІНІН.

МАКСІМ ГОРКІ ПРЫЕХАЎ У МАСКВУ

Сустрэча на Бранскім вакзале

МАСКВА, 19. (БЕЛТА). 19 мая раніцою ў Маскву прыехаў Максім Горкі. Сустракаць улюбёнага пралетарскага пісьменьніка на Бранскі вакзал сабраліся прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый, пісьменьнікі, артысты, прадстаўнікі савецкага друку.

Сярод сустракаўшых т. т. Стэцкі, Фадзееў, Кірпоцін, Макар'еў, Стаўскі, Афінагенаў, Кіршон, Халатаў, Жараў, Новікаў-Прыбой, Огнёў, В. Інбэр, Сімэн, дэлегацыя артыстаў МХАТ і ім. Горкага і інш.

Разам з М. Горкім у Маскву прыехалі яго сын і сакратар П. П. Кручкоў, а таксама дэлегацыя савецкіх пісьменьнікаў у складзе т. т. Панфёрава, П. Леснава, Ус. Іванова і П. Паўлэнка, якая сустрэла Аляксея Максімавіча на ст. Капатоп.

На пляцы Бранскага вакзалу к часу прыходу цягніка сабралася некалькі тысяч працоўных Масквы. Аляксей Максімавіч быў спатканы бурнымі апладысментамі.

Прыезд М. Горкага засьпіт дзень.

Правакацыі на КУЧ ня спыняюцца

Манчжурскія пагранічнікі забараняюць адпраўку цягнікоў

БЭЙПІН, 16 (Белта). Як паведамляюць з Харбіну, сёньня манчжурскі пагранатрад на ст. Пагранічная забараніў адпраўку пасажырскага цягніка ва Уладзівасток, матывуючы, што цягнік ня будзе выпушчан пакуль ня вернецца ў Пагранічную цягнік, адпраўлены 14-га мая на Ўсурыйскую чыгунку. Ня гледзячы на тое, што гэты цягнік вярнуўся ў Пагранічную, пагранатрад не дазволіў адпраўку раніцяга пасажырскага цягніка з прычыны таго, што яму нібыта было паведамлена аб адпраўцы за 8 мінут. Тав. Руды паведаміў аб гэтым праўленьню дарогі.

Бясчынствы хунхузаў

БЭЙПІН, 16 (Белта). Згодна вестак з ХАРБІНУ, учора на 536 кілёмэтры заходняй лініі дарогі АБСТРЭЛЯН ПАШТОВЫ ЦЯГНІК. Там-жа БАНДА ХУНХУЗАЎ ПАДПАЛІЛА КАЗАРМЫ І РАСШЫЛА ЛІНІЮ НА ПРАЦЯГУ 15 МЭТРАЎ; лінія выпраўлена.

На ўсходняй лініі, на перагоне БЭЙШЫХЭ-ІМЕНЬПО толькі дзякуючы таму, што было выпадкова заўважана, што лінія разабрана, цягнік прайшоў добра. Паравоз абстрэлян.

Станцыям ПЕРЫНЦЗЭ І ХАРХА (паўднёвая лінія КУЧ) хунхузамі прад'яўлена патрабаваньне аб дастаўцы харчоў і абмундзіраваньня з пагрозай, у выпадку невыкананьня патрабаваньня,—увесьці ўсіх служачых з дарогі і арганізаваць крушэньне цягнікоў. Адпраўлены з ЛІДАХЭЦЗЫ на ветку цягнік за дрывамі вернут назад з-за забароны хунхузаў.

Сёньня ноччу згараў ушчэнт чыгуначны клюб на ст. МАНЧЖУРЫЯ. Падазраюць падпал. Страты—каля 35 тысяч залатых рублёў.

„Беспасьпяховая і нікчэмная спроба"

Рыская газэта аб германскай сацыял-дэмакратыі

РЫГА, 18. (БЕЛТА). «Сацыял-дэмакрат», камэнтуючы дэкларацыю Гітлера, адзначае, што рашучыя паводзіны ПАЗШ, Англіі і Францыі зрабілі ўплыў на выступленьне Гітлера і надалі яго прамове параўнаўча міралюбівы характар.

Спыняючыся на паводзінах германскіх сацыял-дэмакратаў, газэта піша: «Зусім непрабачальна галасаваньне германскіх сацыял-дэмакратаў за даверце замежнай палітыцы Гітлера». Газэта лічыць, гэту палітычную капітуляцыю германскіх сацыял-дэмакратаў перад Гітлерам «беспасьпяховай і нікчэмнай спробай выратаваць свае мандаты, якія Гітлер раней ці пазьней усё роўна ліквідуе і якія цяпер ня маюць больш ніякага значэньня».

ГАЗЭТУ — У МАСЫ

Усебеларускі конкурс на лепшую дастаўку пэрыядычнага друку

Сваячасова дастаўка бальшавіцкую газэту, брошуру ў калгас, саўгас, прадпрыемства да шырокіх мас працоўных—важнейшы абавязак, усклады ны ўрэдам на нашы органы сувязі.

Між тым, гэты абавязак выконваецца на мясцох, проста кажучы, ганебна. Слова фактам. У Менску на заводзе імя Варашылава газэты ще дастаўляюцца ад 6-7 дзён. У Слуцку, за поўнілёмэтра ад пункта вагону, МТС і МТМ атрымліваюцца газэты і карэспандэнцыі са спазьненьнямі на цэлыя суткі. Хуткая карэспандэнцыя з ярлыком «ваздушная пошта» з Грозава да Слуцка (20 кілёмэтраў) дастаўляецца праз 6-7 дзён. У Бабруйску для Рэўску, у Барысаве для Плешчаніц усе газэты, часопісі і карэспандэнцыі ляжаць па чатыры дні, не дастаўляюцца на раённага цэнтру.

Слаба працуе пізавое зьвяно сувязі на саўгасах, калгасах, у той час, як гэта зьвяно павінна быць асабліва гнутгім, калі веснавая сяўба, прапалачная, уборачная патрабуюць дастаўкі газэты непасрэдна на поле, у брыгады.

Кожнасьць, бюрократызм, а часам і простае шкодніцтва, якое мы маем у некаторых зьвеньнях органаў сувязі, — вось што перашкаджае базовай рабоце на хутчэйшым красоўваньні пэрыядычнага друку на месца.

У мэтах рашучага паляпшэньня працы апарату сувязі ў галіне дастаўкі друку і карэспандэнцыі, бюро кантролю пры камітэце па справах друку СНК БССР пароўдзіць з 20 красавіка па 20 ліпеня ўсебеларускі конкурс на лепшую дастаўку пэрыядычнага друку. Культпроп ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб правядзеньні гэтага конкурсу абавязаў ГК, РК на месцах мабілізаваць грамадзкасьць для ўдзелу ў конкурсе, забясьпечыць стварэньне раённых камісій на конкурсу.

«Вылучыць на ўсіх калгасах, саўгасах, МТС упаўнаважаных па перыядычнаму друку, даручыўшы ім арганізацыю допак з выразкамі з газэт, арганізацыю галосных чытак газэт у брыгадах, на палях калгасаў, саўгасаў і МТС у часе перапынку»—адна з важнейшых задач на прадухіленьні конкурсу. Культпроп ЦК у сваёй пастанове абавязаў цэнтральныя арганізацыі «дабіцца ажыцьцяўленьня дырэктывы НКЗВ ад 4 сакавіка, 1933 г. аб вылучэньні правераных калгаснікаў у якасьці газэтаносцаў і вожчыкаў пошты».

Вясковыя пасьцённыя газэты, піматтыражкі і асабліва раённы друк павінны ўключыцца ў правядзеньне гэтага конкурсу, шырока яго папулярызаваць сярод мас рабочых, калгаснікаў, рабочых, МТС, саўгасаў і адпасобнікаў, разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва навокал справы хутчэйшага прасоўваньня бальшавіцкага друку ў масы.

Баброўскі.

Прэміі па конкурсу на лепшую дастаўку пэрыядычнага друку

Усяго вызначана 240 прэмій на суму 25. 000 руб. і 20 ганаровых прамат ад Белкіраўніцтва сувязі і ЦК прафсаюзу сувязі. Вызначаны наступныя прэміі:

Загадчыкам раёнаддзяленьняў сувязі—5 прэмій па 100 руб. кожная; загадчыкам агенцтваў сувязі—25 прэмій па 75 руб; работнікам Белсаюздруку, Белкіраўніцтва сувязі, цэнтральных выдавецтваў і рэдакцый газэт—5 прэмій па 100 руб.; рэдактарам райгазэт і піматтыражак—10 прэмій па 150 руб.; раённым кантрольным пастом—6 прэмій па 150 руб.; загадчыкам райгазбюро і райаргтаці затарам—3 прэміі па 100 руб.; прамадзкім арганізатарам па распаўсюджваньні друку—20 прэмій па 75 руб.; газэтаналістам носцам (дзяскім)—25 прэмій па 75 руб.; газэтаналістаносцам (дзяскім)—75 прэмій па 75 руб.; кальцэльщыкам перавозчыкам пошты—5 прэмій па 50 руб.; загадчыкам райзямаддзелу—5 прэмій па 100 руб.; дырэктарам МТС, саўгасаў, старшынням калгасаў—40 прэмій па 100 руб.; старшынням сельсаветаў—10 прэмій па 150 руб.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Украінскія вучоныя ў Менску

Учора раніцою ў Менск па запрошэньні Беларускай Акадэміі Навук прыехала група выдатных вучоных Украінскім ССР у складзе прэзыдэнта Усеукраінскай Акадэміі Навук акад. БАГАМОЛЬЦА, віцэ-прэзыдэнта акад. ПАЛАДЗІНА, старшыні 1-га аддзяленьня прыродазнаўчых і тэхнічных навук акад. ФАМІНА, члена прэзыдыуму Акадэміі і сакратара 1-га аддзяленьня акад. ГОЛЬДМАНА, старшыні філіёна акад. СЕМКОЎСКАГА, дырэктара дамаграфічнага інстытуту акад. ПТУХА, сакратара 2-га аддзяленьня (сацыяльна-эканамічных навук) праф. КАМЫШАН, прафэсароў ФІЛІПОВІЧ, КАКОШКА і ШАБЛЕЎСКАГА.

З украінскімі вучонымі прыехаў спэцыяльны карэспандэнт кіеўскай газэты «Пролетарска правда» т. КАГАН.

Украінскія вучоныя зробяць рад дакладаў у Акадэміі, культурных і навуковых установах і азнаёмяцца з гаспадарчым і культурным жыцьцём сталіцы Савецкай Беларусі.

Выступленьне акадэмікаў УАН

Сёньня, 20 мая адбудуцца наступныя даклады акадэмікаў УАН:

Акадэмік А. Ф. ФАМІН прачытае даклад аб «Задачах і пэрспэктывах навуковай працы ў галіне батанікі ў Беларусі». Даклад адбудзецца ў памяшканьні біялёгічнага інстытуту Акадэміі Навук Бел. (Ленінская, 29-35, 2-гі паверх, п. 30), а 1 гадзіне дня.

Акадэмік А. В. ПАЛАДЗІН прачытае даклад аб «Дасьледваньні па хімічнай дынаміцы мускулаў». Даклад адбудзецца ў залі канфэрэнцый Акад. Навук (Ленінская, 23-25), а 7 гадзіне ўвечары.

Акадэмік А. Е. ГОЛЬДМАН прачытае даклад аб «Праблеме ператварэньня энергіі сьвятла ў электрычнасьць». Даклад адбудзецца ў памяшканьні фізьмка-матэматычнага інстытуту АНБ (Унівэрсытэцкі гарадок, фізычны корпус), а 7 гадзіне ўвечары.

Праф. П. Л. ФІЛІПОВІЧ прачытае даклад аб «Выніках навуковай работы ў галіне літаратуразнаўства на Украіне». Даклад адбудзецца ў памяшканьні інстытуту літаратуры АНБ (Ленінская, 23-25, 3 паверх, п. 39), а 7 гадзіне ўвечары.

Праф С. С. КАКОШКА прачытае даклад аб «Барацьбе за Кастрычнік на Украіне». Даклад адбудзецца ў памяшканьні інстытуту гісторыі партыі (К. Маркса, 14), а 7 гадзіне ўвечары.

Акадэмік П. О. Патон прачытае даклад аб «праблемах электразварки ў 2-ой пяцігодцы». Даклад адбудзецца ў Доме Тэхнікі (Камсамольская 25), а 7 гадзіне ўвечары.

Курортныя вагоны

З 15 мая пачалі курсаваць курортныя вагоны Менск — Севастопаль і Менск—Еўпаторыя. Адпраўленьне з цягніком № 54 штодзенна ў 7 гадз. 03 мін.

Вагон Менск—Адэса адпраўляецца па нячотных числах з цягнікам № 80 у 12 гадз. 10 мін.

З 1 чэрвеня пачне курсаваць вагон Менск—Мінэральныя Воды, які будзе адпраўляцца з цягнікам № 56 па нячотных числах з 18 гадз. 50 мін.

Праверка рахункаводных работнікаў у калгасах

Наркамзем БССР правядзе з 25 мая па 15 чэрвеня праверку складу рахункаводаў і бухгальтароў у калгасах.

Праверка мае сваёй мэтай ачысьціць калгасы ад клясава-варожых элемэнтаў, якія зрываюць правільную пастаноўку ўліку і тым самым садзейнічаюць раскрадваньню калгаснай маемасьці.

Для кіраўніцтва праверкай пры Наркамземе створана спэцыяльная камісія ў складзе прадстаўнікоў ЦКК-РСІ, ЦСПСВ, Наркамзему і ЦК камсамолу. Такія-ж камісіі ствараюцца ў раёнах пры райза.

У пастанове Наркамзему па гэтым пытаньні падкрэсьліваецца, што праверцы трэба надаць практычны характар і прыцягнуць да ўдзелу ў ёй шырокія калгасныя масы.

Праверка і чыстка рахункаводаў праводзіцца выключна на агульных сходах калгаснікаў. Рахункаводы і бухгальтары, зьнятыя з работы з прычыны слабай падрыхтаванасьці для рахункаводнай работы, будуць пракіравацца праз курсы, якія з 1 чэрвеня арганізуюцца ва ўсіх раёнах.

Паводле дырэктывы Наркамзему, кожны вылучаемы на работу ў якасьці калгаснага рахункавода павінен быць рэкамэндаваны райза і зацьвярджаны райвыканкомам.

Хроніка

* Двухдэкаднік збору макулатуры для Добрускай папяровай фабрыкі «Герой працы» абвешчан ЦК камсамолу Беларусі па ініцыятыве гомельскіх камсамольцаў і піянэраў. На працягу двух дэкадніку кожны камсамолец і піянэр павінны сабраць ня менш 3-х клгр. макулатуры ў вёсцы і 5 клгр. у горадзе.

* Для ўзмацненьня работы нямецкіх нацсаветаў у Ельскім і Нараўлянскім раёнах ЦВК БССР пастанавіў накіраваць туды на пастаянную работу ня менш 7 сельскіх і раённых работнікаў, ведаючых нямецкую мову. У Роза-Люксэмбургскім нацсавеце арганізуецца грамадзкае харчаваньне на 126 дзяцей. Выдзяляецца 30 комплектаў вопраткі для забесьпячэньня бядняцкай часткі дзяцей.

* Пры Белсаюздруку адбылася ўсебеларуская нарада па юнацкаму друку.

* З 25 па 30 мая па БССР будзе праводзіцца пяцідзеньнік масавага збору уцільсыравіны. Кантора Белсаюзуцільс вызначыла 2.500 р. для прэміяваньня лепшых прафарганізацый, калгасаў сацыялістычнай і паасобных адзачыкаў.

* Для прэміяваньня лепшых калгасаў і саўгасаў за пасьпяховае правядзеньне сяўбы і падрыхтоўку да прапалачнай і ўборачнай кампаніі, з усесаюзнага ясельнага прэміяльнага фонду вызначана для БССР: круп манных 24 тоны, цукру 8 тон, рысавых круп 4 тоны і кандытарскіх вырабаў 4 тоны. Фонд будзе расходавацца за плату па дзяржаўнай цане для паляпшэньня снабжэньня ясьлей калгасаў і саўгасаў, якія маюць лепшыя паказальнікі работы.

Разьмеркаваньне прэміяльнага фонду і вызначэньне прэмій будзе праводзіцца выключна выходзячы з колькасных і якасных паказальнікаў палітычнай і вытворча - грамадзкай актыўнасьці мас раёну, калгасу, саўгасу і з улікам, як паасобныя раёны, калгасы і саўгасы забясьпечылі шырокае ўцягненьне працоўных жанчын у вытворчую работу і пэрыяд сяўбы.

Фонд разьмяркоўваецца конкурсная камісія на падставе матар'ялаў цэнтральнага раённага друку і даных РВК. Гэтыя матар'ялы павінны быць прадстаўлены у арганізтэкстарскі аддзел прэзыдыуму ЦВК да 25 мая.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Прыкладнае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў — лепшы мэтад агітацыі за дзяржаўныя пазыкі.

15 МАЯ зышоў апошні тэрмін раздачы пазыкатрымальнікам аблігацый ранейшых пазык,

у тым ліку і „4-га завяршальнага"

Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкредыту БССР зварачаецца да ўсіх працоўных БССР, якія яшчэ не атрымалі аплачаных аблігацый ранейшых пазык, паведаміць аб гэтым кіраўніцтву АК і ДК БССР для прыцягненьня вінаватых у затрыманьні да адказнасьці і прыняцьця мер да неадкладнай раздачы аблігацый.

У паведамленьнях просьба ўказваць назву калектыву, якім утрымліваліся грошы за пазыку, назву пазыкі і свой адрас.

Начальнік кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкредыту БССР Б. САЎКОЎ.

Адрас кіраўніцтва АК і ДК БССР: Менск, Савецкая, 45.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса адкрыта ад 1 гадз. — Мастацкі замежны фільм СТРАХ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. — 2-ая оэрыя 2-ая амэрыканскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — Мастацкі фільм НЯМЫ ВАРЫЯНТ Пуцёўка ў жыцьцё драма ў 34 эпізодах

„СПАРТАК" Каса адкрыта з 3 г. 30 м. — Мастацкі фільм ХРАМЫ БАРЫН драма ў 7 часткі.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР імя 8-га сакавіка Каса з 1 г. дня — Дзённыя сэансы Шынэль Гогаля у 7 част. Вячэрнія сэансы гукавы фільм „Інтэрнацыянал" у 2-х ч. „Шынэль" Гогаля у 7 ч.

АНОНС! АНОНС! ГУНАВЫ кінатэатр Чырвоная Зорка 5 НЕВЕСТ

КЛІМАВІЦКАЕ аддзяленьне Дзяржбанку ПРАДАЕ належачыя Клімавіцкай цагельнай арцелі 20 тысяч абпаленай цэглы на 1.680 руб. і 400 тон вапны па 22.800 руб. ДЗЯРЖБАНК.

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр імя 8 сакавіка даводзіць да ведама ўсіх школ і дзіцячых установ, што з 15-га мая ЦЭНЫ на БІЛЕТЫ ЗЬНІЖАНЫ на 35 %

Курсы ВОСУ АРГАНІЗУЮЦЬ ГРУПУ БУХГАЛТАРОЎ для Белуціля для працы на раёне. Стыпэндыя ад 100 да 150 руб у м-ц і кватэрных 25 р. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца. Прымаюцца пам. бухг. або рахункаводы ня менш чым з адпагадовым стажам па падвойнай сыстэме бухгальтэрыі. Заявы з дакумантамі аб сац. становішчы, аб адукацыі (ня менш 7 груп), аб узросьце (ня менш 18 г.), аб стажы, аб вызваленьні ад працы (для працуючых), аб згодзе праўленьня (для калгаснікаў) прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск, Камуністычная, 16, пак. № 10) ад 10 да 12 г. штодзенна да 30 мая. Заявы без адпаведных дакумантаў разглядацца ня будуць.

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА" ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА ЗВАРАЧАЦЦА: Савецкая, 63, 2-гі паверх.

Беларускі вучэбны камбінат сувязі працягвае прыём заяў на КУРСЫ дазавучва на базе 5-6-ці груп 7-мігодкі, а таксама абвяшчае прыём заяў на падрыхтоўчыя КУРСЫ ў дзённы тэхнікум сувязі на базе 6-ці груп 7-мігодкі і ў 1 з паўл. гадовы тэхнікум сувязі на базе 7-мігодкі.

Прымаюцца: рабочыя, дзеці рабочых, сувязісты і іх дзеці, калгаснікі і іх дзеці і інш.

Курсы ДАЗАВУЧА рыхтуюць асоб у школу ФЗВ сувязі, якая выпушчае кваліфікаваных манцёраў па тэлеграфіі, тэлефаніі і радыё.

Падрыхтоўчыя курсы рыхтуюць асоб у тэхнікум сувязі, які выпушчае кваліфікаваных тэхнікаў 1-га разраду па тэлеграфіі, тэлефаніі і радыё.

У паўтэрны гадовы тэхнікум сувязі прымаюцца рабочыя, сувязісты і іх дзеці са стажам па службе сувязі іх меньш 2-х год. Залічныя забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 70—100 руб. у м-ц і прыбываючыя з раёнаў—інтэрнатам.

Курсанты ДАЗАВУЧА і падрыхтоўчых курсаў у тэхнікум сувязі стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца.

На курсы у паўтэры-гадовы тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 16 год.

Для залічэньня на вучобу неабходна прадставіць наступныя дакумэнты 1. Даведку аб адукацыі. 2. Даведку аб узросьце. 3. Даведку аб матар'яльным і сацыяльным становішчы, 4. Даведку аб работе ў апараце сувязі (толькі для сувязістаў). 5. Даведку аб здароўі, 6. Заверэную па форме анкету.

Прыём заяў да 1 чэрвеня 1933 г.

Дакумэнты накіроўваць па адрасе: гор. Менск, Камароўка, Лясная вул. д. № 28, тэлеф. 22576.

Пры камбінаце сувязі ёсьць сталоўка.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Нарсуд 2 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзянае ганьбаваньне гр-ну Чахоўскаму Фёдару Іванаву (Уфімская 1, кв. 2), згодна прыгавору нарсуду па абвінавачваньні яго па 196 арт. КК.

ЗГУБЛЕН бумажнік з грашыма і дакумантамі на імя Матусевіч Р. А. Просьба зьвярнуць дакумэнты за ўзнагароду па адрасе: Менск, Козыраве, 2-я лінія 32-18.

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР восьмага мая 1933 г. на падставе арт. 2-4 палаж. аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (збор. закон. і загад. СССР, № 8, паст. 99) ЗАРЭГІСТРАВАНЫ ў рэестры юрыдычных асоб пад № сто сорак дзевятым статут—палажэньне сэктару малага рыбалоўства пры Беларускім Саюзе Спажывецкай Кааперацыі, пад назвай „Рыбкантора Белкаапсаюзу" Адрас Рыбканторы: г. Менск, Савецкая, 43-31. Разьліковы рахунак у Бел. К-ры Дзяржбанку № 91-4804.

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР восьмага мая 1933 г., на падставе арт. 2-4 палаж. аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (збор. закон. і загад. СССР № 8, паст. 99) зарэгістраваны ў рэестры юрыдычных асобпад № сто трыццать дзевятым статут Беларускага Савету Прамысловай Кааперацыі „БЕЛКААПРАМСАВЕТУ". Месцазнаходжаньне Савету: г. Менск, Інтэрнацыянальная, 9. Разьліковы рахунак у Бел. К-ры Дзяржбанку № 105-148.

ДАВОДЗІЦЦА да ведама ўсіх установ і прадпрыемстваў, што з 15 мая пры МАЛЯРБУДЗЕ Белпрамбудтрэсту, (РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ, 3, ВА ДВАРЭ) АДКРЫЛАСЯ ЖЫВАПІСНАЯ МАЙСТЭРНЯ. Прымаюцца ўсякія работы—розныя шыльды, плякаты, рэкламы, манструкцыі і работы па афарміленьні горада. ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА АКУРАТНА. МАЛЯРБУД.

Тэлефоны рэдакцыі „ЗЬВЯЗДА" Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культурнага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага будаўніцтва і снабжэньня кооперацыі і мас. наап.—21-350; транспартны сэктар і бюро расьсьледваньня—21-355; машыннае бюро—21-351; загадчык выдавецт